


ЗАКОН АБ УНС: ПОЎНЫ ТЭКСТ ПА-БЕЛАРУСКУ 4-7

«ВОГНЕНЫЯ» КРОПКІ НА КАРЦЕ ЛЮБАНШЧЫНЫ 8-9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЛЮТАГА 2023 г. АЎТОРАК № 29 (29909)

ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Мінулы год атрымаўся рэкордным у гандлі з Расіяй. Было некалькі базавых задач, якія паставіў Прэзідэнт і ўрад. Асноўная з іх — пераарыентаваць $6,5 млрд з еўрапейскага і ўкраінскага рынкаў на Расію. Гэта задача выканана ў поўным аб'ёме. У лічбах, калі браць у доларах, экспарт у Расію ў нас вырас на 40,5 працэнта, у натуральным выражэнні — на 10,5 працэнта, калі браць фізічныя аб'ёмы. Думаю, 2023 год будзе не менш плённы, чым мінулы. Канешне, чакаць да дасягнутай высокай базы мінулага года такіх жа тэмпаў, напэўна, было б няправільна. Але рост тавараабароту, калі мы лічым яго галоўным паказчыкам пэўнага развіцця, на ўзроўні 6,5 працэнта будзе вельмі добрай лічбай да той высокай базы, якая ўжо дасягнута».*

## ВЫЛІЧЭННЕ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ



**Настаўнік матэматыкі віцебскай гімназіі № 2 Аляксандр ШУГАЛЬ — педагог, вядомы на ўсю краіну. Яно і нядзіўна: толькі за чатыры апошнія гады яго вучні заваявалі 15 дыпломаў на трэцім этапе і 9 дыпломаў на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы. Нядаўна Аляксандру Уладзіміравічу прысвоена ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» ў намінацыі «Сацыяльная сфера».**

**БелТА.**

КОРАТКА

- **Знешнепалітычныя ведамствы Беларусі і Венгрыі падпісалі праграму супрацоўніцтва на 2023 год.**
- **Стартаваў прыём заявак на конкурс найлепшых інавацыйных праектаў 2023 года.**
- **Па праграме «Сямейны капітал» адкрыта амаль 123 тысячы дэпазітаў.**
- **БДУ ўвайшоў у топ-10 універсітэтаў па колькасці заявак на выдачу еўразійскіх патэнтаў.**
- **Праўдзенне трох вучэнняў АДКБ запланавана ў Беларусі сёлета.**

ISSN 1990 — 763X

23029>

9 771990 763008

Блізкія людзі

## АДКРЫТАЕ СЭРЦА

### Калі не палохае адзінокая старасць

**Новай формай работы сацыяльнай службы не так даўно стала замяшчальная сям'я. У Гродзенскай вобласці такіх больш за 70. Першапраходцам стаў Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Ленінскага раёна Гродна. Цяпер тут шэсць такіх сем'яў. Гэта значыць, што для сталых адзінокіх людзей з'явілася магчымасць жыць у звыклых хатніх умовах пад пастаянным наглядам клапатлівага памочніка. Спецыялісты бачаць у замяшчальнай сям'і альтэрнатыву афармлення ў дамы-інтэрнаты.**

Замяшчальная сям'я набывае папулярнасць, паведаміла **спецыяліст па сацыяльнай рабоце аддзялення комплекснай падтрымкі ў крызіснай сітуацыі Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна горада Гродна Алена ГАЙДУК.** Рашэнне аб стварэнні такой паслугі было прынятае ўрадам напрыканцы 2017 года, а ўжо ў 2018-м у Ленінскім раёне Гродна створана першая замяшчальная сям'я. Новай паслугай скарысталіся два чалавекі. Гэта быў першы — і да таго ж станоўчы — вопыт не толькі ў горадзе, але і вобласці. Паступова іх колькасць павялічвалася.

СТАР. 3

Прафарыенцір

## ХТО ЁН, СУЧАСНЫ РАБОЧЫ?

### Выбар прафесійнай адукацыі — эфектыўны старт у будучыню

**Прафарыентацыя абітурыентаў — справа не проста круглагадовая, а бесперапынная штодзённая. У гэтым упэўнены дырэктар Гомельскага дзяржаўнага каледжа кулінарыі Уладзіслаў ШАПЛЯЛЕВІЧ.**

#### КУХОННАЯ РАМАНТЫКА

— Мы — вузкапрофільная ўстанова, якая вось ужо 60 гадоў рыхтуе кадры для грамадскага харчавання. У любой прафесіі ёсць свая рамантыка: з улікам нашай спецыялізацыі мы называем яе «кухоннай». Сёння нам дапамагаюць у папулярызацыі нашых прафесій шматлікія кулінарныя шоу, серыялы і кінастужкі. Кухня — гэта не проста пліта і мікрахвалевая печ, як хтосьці памылкова думае, а цэлы свет. На базе нашага каледжа створаны Цэнтр кампетэнцый кулінарнага мастацтва і хлебапячэння, дзе ёсць суперсучаснае абсталяванне, — падкрэслівае дырэктар. — Мы працуем на прафарыентацыю школьнікаў і ў медыяпрасторы, абавязова прысутнічаем у сацыяльных сетках.



СТАР. 11

З першых вуснаў

# «Ніхто не штурхае дзяржавы дзейнічаць насуперак нацыянальным інтарэсам. Але кампрамісы давядзецца знаходзіць»

**Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся сустрэчай Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з новым генеральным сакратаром АДКБ Імангалі Тасмагамбетавым. Сёлета Беларусь старшынстве ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе сваё старшынства ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў перыяд сістэмнага крызісу міжнародных адносін, беспрэцэдэнтнага абвастрэння ваенна-палітычнай абстаноўкі на Еўразійскім кантыненце і паглыблення канфрантацыі паміж сусветнымі цэнтрамі сілы. У такіх умовах асноўнымі задачамі беларускага старшынства на ўнутраным контуры з'яўляецца павышэнне згуртаванасці дзяржаў — членаў АДКБ і ўрэгуляванне супярэчнасцяў паміж імі дзеля ўмацавання самой арганізацыі, забеспячэнне бяспекі і стабільнасці ў зоне яе адказнасці. Задача на знешнім контуры — узмацненне росту і значнасці АДКБ у сістэме міжнародных адносін. Рэспубліка Беларусь старшынствуе ў АДКБ пад дэвізам «Праз салідарнасць і супрацоўніцтва да міру і бяспекі». Таму сустрэча з новым кіраўніком Сакратарыята арганізацыі мае вызначальны характар.**

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, з Імангалі Тасмагамбетавым яны знаёмыя даўно, хоць раней сустракаліся выключна пратакольна. Імангалі Тасмагамбетаў на папярэдніх пасадах больш працаваў з урадам і іншымі службовымі асобамі. «Але мне прыемна з вамі сустрэцца як з дасведчаным чалавекам. Нешта роднае ёсць, у юнацтве мы з вамі і ў камсамоле працавалі. Вы прайшлі вельмі сур'ёзны шлях, які заслугоўвае павагі. Цяпер людзей, якія маюць такі досвед з савецкіх часоў (па-рознаму можам ацэньваць гэты перыяд), няшмат і яны вельмі каштоўныя. Таму я думаю, што гэты ваш досвед, і на дыпламатычнай у тым ліку рабоце, нам спатрэбіцца. Асабліва сёлета падчас старшынства Беларусі ў АДКБ, ды і на наступныя гады вашай працы ў АДКБ. Ён не проста спатрэбіцца, ён будзе запатрабаваны вельмі сур'ёзна», — сказаў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што ў Казахстане ўжо пачалася змена пакаленняў у палітыцы. Па словах кіраўніка дзяржавы, хацелася б, каб гэта прайшло беспраблемна і ў Беларусі, і ў Казахстане.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння перад АДКБ стаіць дастаткова шмат выклікаў. Беларусь рызыкнула ў сваю праграму старшынства запісаць вырашэнне праблем, якія сёння існуюць. Асабліва на граніцах дзяржаў — членаў АДКБ. «Я нездарма кажу пра ваш досвед, памяць у вас выдатная, вы добра ведаеце і Каўказ, і Цэнтральную Азію, там у нас праблемы. Давайце паспрабуем іх вырашыць і, наколькі магчыма, згуртаваць Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў гэтыя няпростыя часы», — сказаў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што па нашым перыметры — вельмі няпростая абстаноўка. «Калі хтосьці думае, што канфлікт Украіны і Расіі — гэта не наш канфлікт, што ціхенька недзе адсядзімся, дык нічога падобнага. Так не будзе. Прыйдзе час, ён недалёка, калі трэба будзе вызначацца, займаць пэўную пазіцыю. Я не кажу, што на шкоду нацыянальным інтарэсам і гэтак далей. Але з усімі нашымі саюзнымі недахопамі нам давядзецца дакладна вызначаць сваю пазіцыю, сваю лінію для таго, каб дзейнічаць. Разам заўсёды прасцей і лягчэй. Яшчэ раз падкрэсліваю, ніхто не штурхае дзяржавы дзейнічаць насуперак сваім нацыянальным інтарэсам. Але кампрамісы нам давядзецца знаходзіць. Хоць у АДКБ мы ўжо даўно іх знайшлі і дзейнічаем як адзіная арганізацыя. Думаю, гэты складаны перыяд нам трэба прайсці, і ён яшчэ больш згуртуе нашу арганізацыю на тых прынцыпах, якія патрэбныя і магчымыя для кожнай дзяржавы, што ўваходзіць у дадзеную арганізацыю», — канстатаваў Прэзідэнт.

Імангалі Тасмагамбетаў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за падтрымку на лістападаўскай сесіі Савета калектыўнай бяспекі. Генеральны сакратар АДКБ далажыў, што 10 студзеня распачаў выкананне сваіх абавязкаў і цяпер актыўна ўваходзіць у курс спраў. «Самае галоўнае — падрыхтоўка плана мерапрыемстваў і асноўных прыярытэтных пытанняў старшынства Беларусі на 2023 год, мы змаглі ўлічыць усе рашэнні лістападаўскай сесіі і прыярытэты Беларусі», — адзначыў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### На тэрыторыі Беларусі сёлета плануюцца тры вучэнні АДКБ

У размове з журналістамі Імангалі Тасмагамбетаў адзначыў, што візіт у Мінск, сталіцу дзяржавы — старшыні АДКБ, стаў яго першай паездкай у якасці генеральнага сакратара АДКБ. Па яго словах, сустрэча з Прэзідэнтам атрымалася змястоўнай і прадукцыйнай. Было абмеркавана шырокае кола актуальных пытанняў адносна далейшай дзейнасці арганізацыі. «У мэтах умацавання існуючых магчымасцяў у ваеннай сферы прадугледжаны практычныя крокі, якія перш за ўсё накіраваны на забеспячэнне баявой гатоўнасці калектыўных сіл арганізацыі. На тэрыторыі Беларусі сёлета плануюцца тры вучэнні: «Узаемадзеянне», «Эшалон» і «Пошук». Акрамя таго, адным з найважнейшых кірункаў нашай работы будзе ўдасканаленне ўсіх неабходных мерапрыемстваў у інтарэсах procідзеяння тэрарызму і транснацыянальнай злачыннасці, незаконнаму абароту наркотыкаў, незаконнай міграцыі і ў сферы інфармацыйнага забеспячэння. Разнастайнасць задач, якія перад намі стаяць, дыктуе неабходнасць эфектыўнага пазіцыянавання на знешнім контуры. Наша задача вельмі зразумелая. Наша мэта — перш за ўсё забеспячэнне знешнепалітычнага падсвечвання ўсіх магчымасцяў нашай арганізацыі, тых намаганняў, якія робіць арганізацыя для забеспячэння рэгіянальнай бяспекі», — сказаў Імангалі Тасмагамбетаў.

«Я праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку, старшыню Савета калектыўнай бяспекі, аб тых кроках, якія ажыццяўляюцца ў сакратарыяце па далучэнні калектыўных міратворчых сіл АДКБ да міратворчых аперацый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Акрамя ААН, якая з'яўляецца нашым галоўным партнёрам на міжнароднай арэне, мы будзем супрацоўнічаць з іншымі буйнымі міжнароднымі арганізацыямі, такімі як Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, Садружнасць Незалежных Дзяржаў і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе», — расказаў Імангалі Тасмагамбетаў. Ён таксама падкрэсліў, што Аляксандр Лукашэнка як старшыня Савета калектыўнай бяспекі падпісаў план мерапрыемстваў па выкананні лістападаўскай сесіі Савета калектыўнай бяспекі і план асноўных прыярытэтаў старшынства Беларусі ў АДКБ. «Практычна гэты план з'яўляецца для нас праграмай дзеяння, ён насычаны многімі мерапрыемствамі ў сферы статутных кампетэнцый АДКБ», — адзначыў генеральны сакратар Арганізацыі.

# ЖЫЛЛЁ ДЛЯ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб арэндным жыллі для ваеннаслужачых», якім устаноўлены парадак і ўмовы перадачы ва ўласнасць ваеннаслужачым выдзеленага ім арэнднага жылля, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакументам прадугледжана, што такое жыллё бязвыплатна перадаецца ва ўласнасць пры наяўнасці 25 каляндарных гадоў выслугі на ваеннай службе. Пры наяўнасці 20 каляндарных гадоў выслугі на ваеннай службе яно перадаецца на платнай аснове з магчымасцю аплаты яго кошту ў растэрміноўку да 15 гадоў.

Для ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў указам прадугледжаны таксама дадатковыя сацыяльна-прававыя гарантыі. Так, для ваеннаслужачых, якія маюць выслугу 20 каляндарных гадоў і звольненыя ў запас, якія не жадаюць набываць займанае арэнднае жыллё ва ўласнасць, захоўваецца права валодання і карыстання гэтым жыллём з магчымасцю прадаўжэння дагавора найму да паляпшэння імі жыллёвых умоў. Членам сям'і ваеннаслужачага, які загінуў у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў, займанае імі арэнднае жыллё будзе перадавацца ва ўласнасць бязвыплатна незалежна ад выслугі гадоў. За членамі сям'і ваеннаслужачага, які памёр па іншых падставах у перыяд праходжання ваеннай службы, захоўваецца права валодання і карыстання арэндным жыллём на ранейшых умовах да паляпшэння імі сваіх жыллёвых умоў.

Дзеянне ўказа распаўсюджваецца на ваеннаслужачых і прыраўнаваных да іх асоб, якія праходзяць службу ў Мінабароны, МУС, МНС, КДБ, ДПК, Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Аператыўна-аналітычным цэнтры пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, КДК, цэнтральных апаратах Следчага камітэта і ДКСЭ, у арганізацыях, якія ўваходзяць у сістэму дадзеных дзяржаўных органаў або падпарадкаваных ім.

Указ уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

# Зямляк, кіраўнік і герой

## На Віцебшчыне праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя 105-годдзю з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Пятра Машэрава



**Учора каля бюста Пятра Міронавіча ў Віцебску кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і моладзь усклалі кветкі.**

**Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валяр'ян МАЦКЕВІЧ** падзяліўся сваімі ўспамінамі аб сустрэчы з Пятром Міронавічам на XXV з'ездзе Ленінскага камсамола: «Гэты чалавек здзіўляў сваёй прыгажосцю, добрай адкрытай усмешкай і харызмай. Пётр Міронавіч быў вельмі энергічным чалавекам, які ўмеў зараджаць на агульную справу і разам з тым ужо ў якасці кіраўніка краіны адрозніваўся прастасцю ў зносінах. Яго прамова на XXV з'ездзе нас, тады яшчэ юных, вельмі натхніла. Адразу адчуўся моцны прыліў сіл, хацелася рвацца ў бой — на подзвігі ў імя Радзімы».

Памяць аб славутым партызане і кіраўніку савецкай Беларусі жыве ў назвах вуліц і праспектаў, яго імя носяць Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт і Расонская сярэдняя школа, сельскагаспадарчыя комплексы на Віцебшчыне і Брэстчыне, грузавы цеплаход пры Балтыйскім марскім параходстве. У ВДУ праходзіць традыцыйны лыжны пераход па традыцыі, якую калісьці заклаў Машэраў. Сёлета студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта ў гонар 105-гадовага юбілею таксама пройдуць на лыжах па маршруце Віцебск — Орша — Магілёў — Мінск.

«Гэта наш зямляк, яшчэ адзін арыенцір для нашай нацыі. Пётр Машэраў стаяў каля руля нашай цудоўнай краіны 15 гадоў, і за гэты час быў закладзены фундамент нашага далейшага развіцця. Усе глабальныя праекты зарадзіліся менавіта ў той час. Цяпер мы ўдасканальваем іх, працягваем. Я думаю, гэта добры прыклад. І задача для кожнага з нас, кіраўнікоў, зрабіць нешта падобнае, каб нашы нашчадкі гэтак жа нам дзякавалі», — падкрэсліў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Пасля ўрачыстай цырымоніі каля бюста падпольшчыка ўдзельнікі мерапрыемства далучыліся да юбілейнага аўтапрабегу, фінальнай кропкай якога стаў Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт. Там прысутныя ўсклалі кветкі каля мемарыяльнай дошкі і наведалі выставу, прысвечаную жыццёваму шляху Машэрава.

Сёння памятныя мерапрыемствы праходзяць у Расонскім раёне, на радзіме Пятра Міронавіча. На Алеі славы герояў Расоншчыны адбудзецца ўрачысты мітынг каля помніка Машэраву, а ў мясцовай школе ўдзельнікаў збярэ гістарычны вернісаж.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

**Калектыў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Пярцову Уладзіміру Барысавічу ў сувязі з вялікім горам, якое напаткала яго, — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Пярцову Уладзіміру Барысавічу з нагоды вялікага гора, якое напаткала яго, — смерці МАЦІ.**

**Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Пярцову Уладзіміру Барысавічу ў сувязі з вялікім горам, якое напаткала яго, — смерцю МАЦІ.**

# АДКРЫТАЕ СЭРЦА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

З Аленай Гайдук мы накіроўваемся ў шматпавярховік мікраараёна Дзевятоўка, каб наведаць адну з такіх сем'яў. Па дарозе работнік цэнтра ўводзіць у курс справы. У замяшчальнай сям'і, кажа яна, памочнік і падапечны пражываюць разам, вядуць гаспадарку, але гэта не сваякі, а чужыя людзі.

Як і ў кожным відзе паслуг, тут нямала нюансаў. Напрыклад, грашовая кампенсацыя, якая з 1 лютага складае 341 рубель, выплачваецца памочніку толькі пры доглядзе інваліда I-й групы з самым цяжкім, чацвёртым, функцыянальным класам па самаабслугоўванні. Калі іншая група інваліднасці ці чалавек проста старэйшы за 70 гадоў, ніякая грашовая кампенсацыя ў замяшчальнай сям'і не прадугледжана.

— Але нават з выплатамі не кожны здольны выконваць гэту работу. Некаторыя сваіх родных не хочуць даглядаць, нават калі ім спадчыну пакідаюць. У замяшчальнай сям'і догляд доўжыцца 24 гадзіны ў суткі. Да таго ж трэба ўлічваць характар пажылых людзей, — заўважае спецыяліст, калі мы падымаемся на трэці паверх.

Прызнацца, сустракацца з людзьмі ў падобных абставінах няёмка. Мала каму падабаецца выносіць на агульны агляд стан свайго здароўя. Але ў кватэры Сафіі Раманаўны пануе добразычлівая атмасфера. Не толькі сама гаспадыня спакойна ўспрымае прыход карэспандэнта, але і інвалід I групы 90-гадовая Алена Вікенцьеўна. Яны і ёсць замяшчальная сям'я. Разам жывуць некалькі гадоў, а два гады таму ў сацыяльнай службе параілі аформіць дагавор на новую форму сацыяльнага абслугоўвання, згодна з якой Сафія Раманаўна мае пасаду памочніка. Жанчыне 61 год. Са сваёй падапечнай яна знаёмая з дзяцінства. Жылі ў адной вёсцы ў Зэльвенскім раёне, былі суседзямі, больш за тое — Алена Вікенцьеўна яе хрысціла.

— Цяжкае ў яе было жыццё, — распавядае памочніца. — Амаль 40 гадоў працавала на ферме даяркай, тры разы на дзень па 30 кароў даіла, сотні кілаграм малака ўручную цягала ў вёдрах. Пасля дойкі ўсе



чаны і вёдры трэба было памыць, малако здаць. Працавала без водпуску і выхадных, ды і дома яшчэ свая гаспадарка. Цяпер вось суставы баляць.

Сама Алена Вікенцьеўна толькі слухае і крыху ўсміхаецца. У яе вельмі добры і прыемны твар. Мне хочацца пагаварыць з ёй аб мінулым. Што памятае, каго ўспамінае? Аказалася, маладосць сваю, а таксама сястру, якую падчас акупацыі немцы вывезлі на работу ў Германію. Як адпраўлялі ёй туды сухары, як яна адмарозіла на чужыне ногі. Як потым вярталася пасля вызвалення дамоў на таварных цягніках. І яна, і сястра засталіся жыць у роднай вёсцы, замуж так і не выйшлі, жылі ўсё жыццё разам у бацькоўскім доме. А гадоў шэсць таму сястры не стала, і Алена Вікенцьеўна некаторы час жыла адна, пакуль не адчула, што без дапамогі не абысціся.

— Яна не адразу да мяне пераехала, — удакладняе Сафія Раманаўна. — Амаль год жыла ў пляменніка ў Смаленскай вобласці. Яе брата ў свой час накіравалі туды на працу, застаўся, стварыў сям'ю. Брата не стала, але пляменнік памятаў пра цётку і прапанаваў пажыць у яго. Праз некаторы час хросная захацела вярнуцца на радзіму, казала, што не хоча спачываць на чужой зямлі. Прыехала пагасціць да мяне, яшчэ маю маму застала жывой, праўда, ненадоўга. Мамы не стала, і я прапанавала нашай вясковай суседцы застацца. Яна пагадзілася.

— А хата ваша пустая стаіць?

Суразмоўніца паківала: так. Яна ведае, што з дома многа што скралі, непакоіцца, каб не вынеслі помнік, які яна заказала некалькі гадоў таму. Загадзя паклапацілася.

Вёска за сем кіламетраў ад Зэльвы і недалёка ад Ваўкавыска, але дамы там амаль не прадаюцца, кажа Сафія Раманаўна. Многія не аформленыя, у тым ліку і дом яе хроснай. Таму, хутчэй за ўсё, яго знясуць.

Аб тым, каб паехаць туды летам, размова не стаіць. Апошнім часам і выхад на вуліцу стаў для жанчыны праблемай.

— Раней вазіла на вуліцу ў калясцы. У сацыяльнай службе прапанавалі набыць спецыяльныя сходні для спуску інваліднай каляскі з пад'езда. За іх потым грошы вяртаюць, каляску таксама бясплатна выдаюць. Але я цяпер баюся, што маёй хроснай ізноў будзе дрэнна. Калі ёсць якая патрэба — паехаць, напрыклад, у паліклініку, можна выклікаць сацыяльнае таксі, — тлумачыць сітуацыю Сафія Раманаўна і пачынае разважаць пра адзінокую старасць.

Прызнаецца, што некалькі месяцаў даглядала старых у інтэрнаце. Вось там і ўбачыла, што такое застацца адзінокім. Многім цяжка ад думкі, што пад старасць аказаліся нікому не патрэбнымі. Для яе было незразумела, чаму многія старыя, маючы сваякоў, аказваюцца ў інтэрнатах. Раней жылі ў больш складаных умовах, але даглядалі старых бацькоў, іншых родных, паважалі іх. Спагадлівыя адносіны да старэйшых былі, як правіла, нормай жыцця. Дарэчы, гэтымі прынцыпамі Сафія Раманаўна карыстаецца і цяпер. Яна дзевяць гадоў даглядала сваю маці, калі тая ляжала ў коме, зараз у яе жыве і 90-гадовая свякроў. Яна сем гадоў ляжала без руху, але нядаўна паднялася і пайшла. Я бачыла, як яна з хадункамі па калідоры ходзіць. Алена Вікенцьеўна не такая шпаркая, ходзіць толькі па патрэбе, а больш ляжыць ці сядзіць. За жыццё набегалася, жартуе яна.

У кожнай жанчыны асобны пакой.

Дзень у гаспадыні пачынаецца ў пяць раніцы і размеркаваны амаль па гадзінах. Тут і гатоўка ежы, і водныя працэдуры, і прыборка памяшканняў, і прыём лекаў. Як былы дыетолаг вялікую ўвагу ўдзяляе правільнаму харчаванню. Гэта аснова даўгалецця, лічыць яна. Правільнае кармленне садзейнічае добрай рабоце ўсёй страўнікавай сістэмы, не дае арганізму пакутаваць ад таксінаў. Сырнікі — амаль што адзіная смажаная страва ў рацыёне. Але яны гатуюцца пад крышкай і атрымліваюцца нібы паравыя. Ранкам абавязковыя кашы, крупу перад гэтым прамываюць. Наогул, харчаванне такое, як для дзяцей у садку.

Не магла не спытаць пра каранавірус. Здаецца, хвароба мала каго абмінула. Але ў кватэры Сафіі Раманаўны яе пазбеглі. Сама гаспадыня кажа, што засцерагалася як магла: насіла маску, прадукты купляла на рынку праз акенцы, у аптэцы шукала магчымасць пазбягаць чэргаў і гэтак далей. Прапаноў ад медыкаў зрабіць прышчэпку не паступала, мабыць, у сілу ўзросту, а вось ад грыпу прышчапіліся, пакуль паспяхова.

— Чаму вы, такая прыгожая жанчына, замуж не выйшлі? — пытаюся ў Алены Вікенцьеўны на развітанне.

Яна ўсміхнулася. Кажа, сястра не выйшла, бо мужчыны многія з фронту не вярнуліся, і ёй, па ўсёй бачнасці, такі ж лёс выпаў. Але ў адзіноце не засталася. Суседка не забылася аб ёй. Адкрыла для яе сваё сэрца. Адбылося так, як і павінна быць у жыцці: спакойная, дагледжаная старасць побач з блізкім і клапатлівым чалавекам.

З цёплым ураджаннем мы з прадстаўніком сацыяльнага цэнтра Аленай Гайдук пакідаем сям'ю, якая атрымала статус замяшчальнай. Відавочна, што такі вопыт варта пашыраць. Алена заўважае, што замяшчальных сем'яў магло б быць больш, але стрымлівальным фактарам з'яўляецца абавязковая ўмова мець асобны пакой для падапечнага. Між тым адзінокія грамадзяне амаль усе жывуць у аднапакаёвых кватэрах. А гэта значыць, што аформіць памочніка з пражываннем там немагчыма. У такіх выпадках прапануюцца іншыя формы: дапамога сацыяльнага работніка дома, паслугі сядзелкі, гасцявыя сем'і. Сталым людзям не трэба самастойна шукаць інфармацыю пра гэта. Работнікі сацыяльнай службы самі прыйдуць і параяць спрыяльны варыянт.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У МЗС КНР назвалі ЗША «найбуйнейшай шпіёнскай дзяржавай»

ЗША з'яўляюцца найбуйнейшай у свеце шпіёнскай дзяржавай з самай шырокай разведвальнай сеткай. Аб гэтым заявіў на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Ван Вэньбінь, паведаміла ТАСС. Ён таксама адзначыў, што «Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША праглядае тэкставыя паведамленні і праслухоўвае тэлефонныя званкі, у тым ліку высокапастаўленых асоб Германіі, Францыі, Нарвегіі, Швецыі, Нідэрландаў і іншых еўрапейскіх краін». Як вядома, у пачатку лютага ўлады ЗША зафіксавалі над кантынентальнай часткай краіны кітайскі аэрастат на вышыні, якая значна перавышала стандартныя параметры для камерцыйных авіяперавозак, ён не ўяўляў пагрозы для людзей на зямлі. Амерыканскія ўзброеныя сілы збілі гэты «разведвальны шар» у межах паветраных граніц Злучаных Штатаў. Ён, як сцвярджае Пентагон, займаўся «зборам важнай інфармацыі». У сувязі з гэтым здарэннем дзяржсакратар ЗША Энтані Блінкен адклаў візіт у Кітай. МЗС КНР выказала пратэст супраць нападак і паклёпу з боку Вашынгтона. Як растлумачылі ў Пекіне, метэаралагічны зонд аказаўся ў амерыканскай паветранай прасторы выпадкова.

### Нікас Хрыстадулідзіс перамог на выбарах прэзідэнта Кіпра

Экс-міністр замежных спраў Рэспублікі Кіпр Нікас Хрыстадулідзіс стане восьмым па ліку прэзідэнтам гэтай дзяржавы пасля набыцця востравам незалежнасці ў 1960 годзе. У другім туры выбараў, якія адбыліся ў нядзелю, 49-гадовы Хрыстадулідзіс з перавагай амаль у чатыры працэнтныя пункты атрымаў перамогу над сваім 66-гадовым сапернікам, былым галоўным перагаворшчыкам грэка-кіпрскага боку па ўрэгуляванні на востраве і экс-пастпрэдам Кіпра пры ААН Андрэасам Маўраянісам, паведаміла ТАСС. Такім чынам, саперніцтва двух кар'ерных дыпламатаў завяршылася поспехам больш высокапастаўленага і адначасова маладога. Хрыстадулідзіс карыстаўся хоць і не надта адкрытай, але пры гэтым упэўненай падтрымкай сыходзячага прэзідэнта краіны Нікаса Анастасіядзіса, які практычна благаславіў яго ў пачатку мінулага года на ўдзел у выбарчай кампаніі, прычым у абыход выбарчых працэдур кіруючай партыі «Дэмакратычны збор». Як адзначыла ТАСС, перамогу Хрыстадулідзіса можна ў нейкай меры назваць яшчэ адным палітычным поспехам Анастасіядзіса.

### Прэзідэнт Ізраіля папярэдзіў аб калапсе ў краіне

Прэзідэнт Ізраіля Іцхак Герцаг падчас выступлення па тэлебачанні папярэдзіў, што краіна знаходзіцца на мяжы «канстытуцыйнага і сацыяльнага калапсу» ў выніку шматтысячных пратэстаў супраць судовай рэформы, якая прасоўваецца ўрадам, і заклікаў кабінет міністраў прыслухацца да патрабаванняў пратэстоўцаў. «Адсутнасць дыялогу разрывае нас на часткі знутры, і я кажу вам гучна і ясна: гэтая парахавая бочка вось-вось выбухне. Гэта надзвычайная сітуацыя», — заявіў Герцаг. Ён адзначыў, што існуе сур'ёзная занепакоенасць тым, што змены, запланаваныя ўрадам прэм'ер-міністра Біньяміна Нетаньяху, настолькі радыкальныя, што выключаюць сумненні ў будучыні дэмакратыі Ізраіля, яго прывабнасці для замежных інвестараў і сувязях з саюзнікамі. У прыватнасці, Нетаньяху і яго прыхільнікі хочуць павысіць ролю ўрада ў прызначэнні суддзяў і значна абмежаваць паўнамоцтвы Вярхоўнага суда. СМІ звяртаюць увагу, што пратэсты супраць судовай рэформы праходзяць на фоне росту гвалту паміж ізраільцянамі і палесцінцамі ў Іерусаліме і на заходнім беразе Іардана.

Надвор'е

## УДЗЕНЬ — ДА 6 ЦЯПЛА, А НОЧЧУ — МІНУС 13

**Апошні месяц зімы складана назваць суровым. Але ў апошнія тыдні ён дэманструе няпросты і вельмі капрызны характар. Вось і гэты тыдзень будзе для сіноптыкаў наравістым. Умовы надвор'я на тэрыторыі краіны ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму ў многіх раёнах краіны істотных ападкаў не чакаецца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

І ў сераду будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай па захадзе ў асобных раёнах краіны магчымы туман і слабы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 0 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў па паўночным усходзе, а ўдзень — ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла.

Не будзе дажджу і снегу і ў чацвер. Толькі месцамі, у асноўным па ўсходзе краіны, магчымы невялікі снег. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра складзе ад 0 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў па паўночным усходзе. Пры праясненнях у паўночна-ўсходніх раёнах прагназуецца да 13 марозу. Днём будзе мінус 3 — плюс 3 градусы, а па паўднёвым захадзе — да 5 цяпла.

А вось у пятніцу да нас паступяць істотныя ападкі і пацяплее ўначы. Уначы месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовы снег, мокры снег, па захадзе з дажджом. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе ў межах ад мінус 7 градусаў па ўсходзе да плюс 2 градусаў па паўднёвым захадзе. Пры праясненнях — да 8—10 градусаў марозу. Удзень прагназуецца мінус 4 — плюс 3 градусы, а па паўднёвым захадзе — да плюс 6 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца, месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 6 градусаў па ўсходзе да плюс 3 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. Днём будзе аднолькава цёпла: тэмпература — ад мінус 2 градусаў у паўночна-ўсходніх да плюс 6 градусаў у паўднёва-заходніх раёнах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# АБ УСЕБЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ СХОДЗЕ*

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 25 студзеня 2023 г.*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 30 студзеня 2023 г.*

Гэты Закон у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь вызначае прававы статус, кампетэнцыю, парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу, прынцыпы і арганізацыйныя асновы яго дзейнасці, а таксама правы і абавязкі дэлегата Усебеларускага народнага сходу.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Прававы статус Усебеларускага народнага сходу**

Усебеларускі народны сход з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым органам народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду.

**Артыкул 2. Прававое рэгуляванне дзейнасці Усебеларускага народнага сходу**

Парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь і іншымі законамі.

Кампетэнцыя і парадак дзейнасці Усебеларускага народнага сходу вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі.

Парадак рэалізацыі Усебеларускім народным сходам сваіх паўнамоцтваў вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі і Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, што зацвярджаецца Усебеларускім народным сходам.

**Артыкул 3. Прынцыпы дзейнасці Усебеларускага народнага сходу**

Дзейнасць Усебеларускага народнага сходу грунтуецца на прынцыпах:

народаўладдзя;

вяршэнства права і законнасці;

дэмакратычнасці;

пераемнасці дзяржаўнай палітыкі;

сацыяльнай справядлівасці;

галоснасці;

калегіяльнасці;

свабоднага абмеркавання і прыняцця рашэнняў.

**Артыкул 4. Узаемадзеянне Усебеларускага народнага сходу з дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, грамадзянскай супольнасцю**

Усебеларускі народны сход рэалізоўвае свае канстытуцыйныя функцыі як непасрэдна, так і шляхам узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, грамадзянскай супольнасцю.

Усебеларускі народны сход пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў, у тым ліку пры прыняцці рашэнняў і дачы даручэнняў, не мае права падмяняць дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі і службовых асоб, выконваць іх функцыі, а таксама ўмешвацца ў іх дзейнасць.

**Артыкул 5. Тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу**

Тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу складае пяць гадоў.

Паўнамоцтвы Усебеларускага народнага сходу чарговага склікання пачынаюцца з дня яго першага пасяджэння і заканчваюцца ў дзень адкрыцця першага пасяджэння Усебеларускага народнага сходу новага склікання.

Першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу склікаецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй не пазней за 60 дзён пасля выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання.

## ГЛАВА 2
## СКЛАД І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 6. Склад Усебеларускага народнага сходу**

Усебеларускі народны сход фарміруецца з дэлегатаў, якія прадстаўляюць розныя сацыяльныя пласты і групы грамадства.

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца:

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў у сувязі з заканчэннем тэрміну яго знаходжання на пасадзе або датэрмінова ў выпадку яго адстаўкі;

прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады;

прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў;

прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.

Найбольшая колькасць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу складае 1200 чалавек.

**Артыкул 7. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад заканадаўчай улады**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад заканадаўчай улады з'яўляюцца дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 8. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад выканаўчай улады**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад выканаўчай улады з'яўляюцца:

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, яго намеснікі і іншыя члены Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

старшыні абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў;

старшыні раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчых камітэтаў.

**Артыкул 9. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад судовай улады**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад судовай улады з'яўляюцца:

старшыня, намеснік старшыні і суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

старшыня, намеснікі старшыні і суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў з'яўляюцца:

прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў ад кожнай вобласці, якія выбіраюцца абласнымі Саветамі дэпутатаў з ліку дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў абласнога, базавага і пярвічнага тэрытарыяльных узроўняў у парадку, установленым рэгламентамі мясцовых Саветаў дэпутатаў, з улікам патрабаванняў гэтага Закона, Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і іншых законаў. Нормы прадстаўніцтва мясцовых Саветаў дэпутатаў ад кожнай вобласці вызначаюцца Цэнтральнай выбарчай камісіяй прапарцыянальна колькасці выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай вобласці;

дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Найбольшая колькасць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў складае 350 чалавек.

**Артыкул 11. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці з'яўляюцца прадстаўнікі суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, якія ўдзельнічаюць у выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу.

Умовы і парадак удзелу суб'ектаў грамадзянскай супольнасці ў выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу вызначаюцца гэтым Законам, Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, законам, які замацоўвае асновы грамадзянскай супольнасці, і іншымі законамі.

Найбольшая колькасць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці складае 400 чалавек.

Ад кожнага суб'екта грамадзянскай супольнасці, які ўдзельнічае ў выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, выбіраецца роўная колькасць дэлегатаў, якая вызначаецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй зыходзячы з колькасці суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, якія ўдзельнічаюць у выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, і ўстаноўленай часткай трэцяй гэтага артыкула найбольшай колькасці дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці. Пры гэтым забяспечваецца прадстаўніцтва ад кожнай вобласці і горада Мінска.

Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці выбіраюцца вышэйшымі органамі суб'ектаў грамадзянскай супольнасці з ліку членаў гэтых суб'ектаў (членаў арганізацый, якія ўваходзяць у склад суб'екта грамадзянскай супольнасці). Парадак вылучэння і выбрання дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці вызначаецца статутамі суб'ектаў грамадзянскай супольнасці з улікам патрабаванняў гэтага Закона, Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і іншых законаў.

## ГЛАВА 3
## КАМПЕТЭНЦЫЯ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 12. Кампетэнцыя Усебеларускага народнага сходу**

Усебеларускі народны сход:

зацвярджае асноўныя кірунки ўнутранай і знешняй палітыкі, ваенную дактрыну, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі;

зацвярджае праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

заслухоўвае штогадовыя пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да Парламента Рэспублікі Беларусь;

заслухоўвае Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь аб выкананні праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

прапануе змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;

валодае правам заканадаўчай ініцыятывы;

прапануе правядзенне рэспубліканскіх рэферэндумаў;

мае права разглядаць пытанне аб легітымнасці выбараў;

прымае рашэнне аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады ў выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь або ўчынення дзяржаўнай здрады ці іншага цяжкага злачынства;

мае права ўвесці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнае або ваеннае становішча пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, і ў выпадку бяздзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па гэтых пытаннях;

па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, папярэдне ўзгодненай з Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу, выбірае старшыню, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыню, намеснікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыню і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, вызваляе іх ад пасады па падставах, прадугледжаных законам;

зацвярджае спіс народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прымае рашэнне аб магчымасці накіравання ваеннаслужачых, супрацоўнікаў ваенізаваных арганізацый, іншых асоб за межы Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі і дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі;

устанаўлівае дзяржаўныя святы, святочныя дні і памятныя даты;

узнагароджвае Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь, а таксама прапануе асоб для ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе іншыя ўстаноўленыя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі паўнамоцтвы, неабходныя для рэалізацыі ўскладзеных на яго канстытуцыйных функцый.

**Артыкул 13. Прыняцце Усебеларускім народным сходам рашэнняў стратэгічнага і праграмнага характару**

Усебеларускі народны сход прымае рашэнні аб зацвярджэнні асноўных кірункаў унутранай і знешняй палітыкі, ваеннай дактрыны, канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Праект адпаведнага рашэння ўносіцца на разгляд Усебеларускага народнага сходу Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з іх паўнамоцтвамі.

**Артыкул 14. Заслухоўванне Усебеларускім народным сходам штогадовых пасланняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да Парламента Рэспублікі Беларусь**

Штогадовыя пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да Парламента Рэспублікі Беларусь заслухоўваюцца на пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу без абмеркавання і прыняцця па іх рашэнняў.

**Артыкул 15. Заслухоўванне Усебеларускім народным сходам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь аб выкананні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь**

Усебеларускі народны сход штогод заслухоўвае Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь аб выкананні зацверджанай Усебеларускім народным сходам праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь заслухоўваецца на пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу з абмеркаваннем прадстаўленай ім інфармацыі і прыняццем пры неабходнасці рашэння.

Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу маюць права ў парадку, установленым Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, накіраваць у Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу пытанні Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь аб выкананні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу забяспечвае абагульненне пытанняў, якія папярэдне паступілі, і накіроўвае іх канчатковы спіс у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Адказы на пытанні дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу павінны быць адлюстраваны ў інфармацыі Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Падчас заслухоўвання Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь дэлегаты Усебеларускага народнага сходу могуць задаваць яму пытанні, калі Усебеларускім народным сходам не будзе прынята іншае рашэнне.

Па выніках заслухоўвання Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Усебеларускі народны сход мае права ўнесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы па пытаннях выканання праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 16. Рэалізацыя Усебеларускім народным сходам права заканадаўчай ініцыятывы**

Права заканадаўчай ініцыятывы рэалізоўваецца Усебеларускім народным сходам праз унясенне ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праектаў законаў, у тым ліку аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Пытанне аб унясенні ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праекта закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь разглядаецца Усебеларускім народным сходам па ініцыятыве Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як аднаой трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 17. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму**

Усебеларускі народны сход мае права ўнесці Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму.

Пытанне аб унясенні Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму разглядаецца Усебеларускім народным сходам па ініцыятыве Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як аднаой трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

Рашэнне Усебеларускага народнага сходу аб унясенні Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму павінна змяшчаць інфармацыю аб прапанаваных:

даце правядзення рэспубліканскага рэферэндуму;

пытаннях, якія выносяцца на рэспубліканскі рэферэндум.

Калі прапанова аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму ўнесена Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь з захаваннем патраба-

ванняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства і пытанне, якое выносіцца на рэспубліканскі рэферэндум, прызнана згодна з заключэннем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь канстытуцыйным, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь назначае рэспубліканскі рэферэндум.

**Артыкул 18. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб легітымнасці выбараў**

Усебеларускі народны сход разглядае пытанне аб легітымнасці выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прапанове Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як адной трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

У выпадку ўнясення Усебеларускаму народнаму сходу прапановы аб разглядзе пытання аб легітымнасці выбараў Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу адначасова інфармуе аб гэтым Цэнтральную выбарчую камісію.

Прапанова аб разглядзе пытання аб легітымнасці выбараў уносіцца Усебеларускаму народнаму сходу не пазней за пяць дзён з дня апублікавання вынікаў выбараў і разглядаецца ім не пазней як 10 дзён з дня ўнясення такой прапановы.

Прапанова аб разглядзе Усебеларускім народным сходам пытання аб легітымнасці выбараў павінна быць матываванай.

Па выніках разгляду пытання аб легітымнасці выбараў Усебеларускі народны сход можа прыняць адно з наступных рашэнняў:

аб легітымнасці выбараў;

аб нелегітымнасці выбараў.

Галасаванне па пытанні аб легітымнасці адпаведных выбараў праводзіцца Усебеларускім народным сходам адзін раз.

У выпадку непрыняцця Усебеларускім народным сходам рашэння наконт легітымнасці выбараў пытанне аб легітымнасці выбараў паўторнаму разгляду не падлягае.

Рашэнне Усебеларускага народнага сходу аб нелегітымнасці выбараў з'яўляецца падставай для прызнання Цэнтральнай выбарчай камісіяй выбараў несапраўднымі і адмены раней прынятага рашэння аб выніках выбараў. У гэтым выпадку прызначаюцца і праводзяцца паўторныя выбары ў парадку, устаноўленым Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб прызначэнні паўторных выбараў прымаецца ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь не пазней за 10 дзён з дня прыняцця Усебеларускім народным сходам рашэння аб нелегітымнасці выбараў.

**Артыкул 19. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа быць зняты з пасады ў выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь або ўчынення дзяржаўнай здрады ці іншага цяжкага злачынства.

Прапанова аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і зняцці яго з пасады ўносіцца Усебеларускаму народнаму сходу па ініцыятыве не менш як адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь або не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам.

Прапанова, указаная ў частцы другой гэтага артыкула, уносіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Законам і іншымі законамі.

Прапанова аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і зняцці яго з пасады павінна быць матываванай.

Расследаванне абвінавачвання арганізоўваецца Усебеларускім народным сходам.

Пасля ўнясення Усебеларускаму народнаму сходу прапановы аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь у сістэматычным або грубым парушэнні ім Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу на працягу 10 дзён звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з прапановай аб дачы заключэння аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу 14 дзён з дня ўнясення Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу адпаведнай прапановы дае заключэнне аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Пасля ўнясення Усебеларускаму народнаму сходу прапановы аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь ва ўчыненні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства Усебеларускім народным сходам на працягу 10 дзён ствараецца спецыяльная камісія з ліку дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу (далей — спецыяльная камісія), якая на працягу 14 дзён з дня стварэння дае заключэнне аб наяўнасці ў дзеяннях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прыкмет учынення ім дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства. Для стварэння спецыяльнай камісіі можа быць склікана пазачарговае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу. Аб стварэнні спецыяльнай камісіі, зацвярджэнні яе складу і выбранні яе старшыні Усебеларускі народны сход прымае рашэнне.

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу і спецыяльная камісія маюць права запытаць і ва ўстаноўленыя імі тэрміны атрымаць ад дзяржаўных органаў, іншых арганізацый і службовых асоб дакументы, іншыя матэрыялы і інфармацыю, неабходныя для разгляду пытання аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады. Спецыяльная камісія таксама мае права прыцягнуць для дачы кансультацый спецыялістаў, якія маюць неабходныя веды ў пытаннях, што падлягаюць вырашэнню ў рамках падрыхтоўкі заключэння аб наяўнасці ў дзеяннях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прыкмет учынення ім дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства.

Запыты Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу і спецыяльнай камісіі аб прадстаўленні неабходных для разгляду пытання аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады дакументаў, іншых матэрыялаў, аб выяўленні пэўных абставін, аб прыцягненні спецыялістаў, дачы растлумачэнняў, кансультацый, аб выкладанні меркавання па разглядаемым пытанні, а таксама іншыя запыты абавязковыя для выканання для ўсіх дзяржаўных органаў, іншых арганізацый і службовых асоб, якім яны адрасаваны.

Заключэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь аб адсутнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заключэнне спецыяльнай камісіі аб адсутнасці ў дзеяннях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прыкмет учынення ім дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства з'яўляюцца падставамі для прыняцця Усебеларускім народным сходам рашэння аб спыненні расследавання абвінавачвання і адхіленні абвінавачвання.

Заключэнне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заключэнне спецыяльнай камісіі аб наяўнасці ў дзеяннях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прыкмет учынення ім дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства з'яўляюцца падставамі для разгляду Усебеларускім народным сходам пытання аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады.

Пытанне аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і зняцці яго з пасады падлягае разгляду не пазней за 10 дзён пасля атрымання адпаведных заключэнняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і спецыяльнай камісіі.

Непрыняцце Усебеларускім народным сходам рашэння аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады на працягу двух месяцаў з дня ўнясення прапановы, указанай у частцы другой гэтага артыкула, азначае адхіленне абвінавачвання.

Прапанова аб вылучэнні абвінавачвання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і зняцці яго з пасады не можа быць уносена ў перыяд разгляду ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Парламента Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб уведзенні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнага або ваеннага становішча**

Усебеларускі народны сход мае права ўвесці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнае або ваеннае становішча пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, і ў выпадку бяздзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па гэтых пытаннях. Бяздзейнасцю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з'яўляецца непрыняцце ім неабходных мер па ліквідацыі абставін, якія ствараюць небяспеку жыццю і здароўю людзей, тэрытарыяльнай цэласнасці і існаванню дзяржавы, а таксама па ліквідацыі ваеннай пагрозы або адбіцці нападзення на Рэспубліку Беларусь.

Пытанне аб уведзенні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнага або ваеннага становішча разглядаецца Усебеларускім народным сходам па ініцыятыве Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Аб ініцыіраванні разгляду Усебеларускім народным сходам пытання аб уведзенні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнага або ваеннага становішча Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу або Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прымае пастанову.

**Артыкул 21. Выбранне Усебеларускім народным сходам суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, вызваленне іх ад пасады**

Усебеларускі народны сход выбірае старшыню, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыню, намеснікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыню і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Кандыдатуры для выбрання на пасады, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, разглядаюцца Усебеларускім народным сходам па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, папярэдне ўзгодненай з Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу.

Пытанне аб выбранні на пасады, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, павінна быць разгледжана на найбліжэйшым пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня, намеснік старшыні і суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыня, намеснікі старшыні і суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыня і члены Цэнтральнай выбарчай камісіі могуць быць вызвалены ад пасады Усебеларускім народным сходам у сувязі з немагчымасцю выканання імі сваіх абавязкаў па стане здароўя, па ўласным жаданні і на іншых падставах, прадугледжаных законам. Пытанне аб вызваленні ўказаных асоб ад пасады разглядаецца Усебеларускім народным сходам па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, папярэдне ўзгодненай з Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 22. Зацвярджэнне Усебеларускім народным сходам спіса народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь**

Усебеларускі народны сход зацвярджае спіс народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, сфарміраваны ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

Зацверджаны Усебеларускім народным сходам спіс народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь накіроўваецца ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь не пазней як за адзін месяц да заканчэння паўнамоцтваў народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, уключаных у папярэдні спіс.

**Артыкул 23. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб магчымасці накіравання ваеннаслужачых, супрацоўнікаў ваенізаваных арганізацый, іншых асоб за межы Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі і дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі**

Усебеларускі народны сход па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь разглядае пытанне аб магчымасці накіравання ваеннаслужачых, супрацоўнікаў ваенізаваных арганізацый, іншых асоб за межы Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі і дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі.

У прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб разглядзе пытання аб магчымасці накіравання ваеннаслужачых, супрацоўнікаў ваенізаваных арганізацый, іншых асоб за межы Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі і дзейнасці па падтрыманні міжнароднага міру і бяспекі, як правіла, вызначаюцца раён іх дзеяння, задачы, колькасць, падначаленасць, тэрмін знаходжання і парадак замены, умовы вываду, а таксама іншыя арганізацыйныя мерапрыемствы па забеспячэнні іх накіравання.

**Артыкул 24. Устанаўленне Усебеларускім народным сходам дзяржаўных свят, святочных дзён і памятных дат**

Усебеларускі народны сход па прапанове Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як адной трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу прымае рашэнне аб устанаўленні дзяржаўных свят, святочных дзён і памятных дат.

**Артыкул 25. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытанняў аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь**

Усебеларускі народны сход прымае рашэнні аб узнагароджанні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь.

У выпадку ўзнагароджання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь іх уручэнне ажыццяўляецца ва ўрачыстай абстаноўцы на пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу.

Усебеларускі народны сход па прапанове Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як адной трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу можа ініцыіраваць прадстаўленне да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь іншых асоб у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 26. Разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб адмене прававых актаў, іншых рашэнняў дзяржаўных органаў і службовых асоб**

Пытанне аб адмене прававых актаў, іншых рашэнняў дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў, разглядаецца Усебеларускім народным сходам па ініцыятыве Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу або не менш як адной трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

Рашэнне па пытанні, указаным у частцы першай гэтага артыкула, прымаецца ў тэрмін, вызначаны Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу, але не пазней за адзін месяц з дня ўнясення адпаведнай ініцыятывы.

**Артыкул 27. Ажыццяўленне Усебеларускім народным сходам іншых паўнамоцтваў, неабходных для рэалізацыі ўскладзеных на яго канстытуцыйных функцый**

Усебеларускі народны сход дае абавязковыя для выканання даручэнні дзяржаўным органам і службовым асобам, атрымлівае інфармацыю ад дзяржаўных органаў і службовых асоб, ажыццяўляе іншыя ўстаноўленыя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі паўнамоцтвы, неабходныя для рэалізацыі ўскладзеных на яго канстытуцыйных функцый.

## ГЛАВА 4
## ФОРМЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ. РАШЭННІ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 28. Формы дзейнасці Усебеларускага народнага сходу**

Усебеларускі народны сход ажыццяўляе сваю дзейнасць у форме пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу, пасяджэнняў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, іншых органаў Усебеларускага народнага сходу, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з гэтым Законам і Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

Пытанні аб легітымнасці выбараў, аб зняцці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады, аб адмене прававых актаў, іншых рашэнняў дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў, папярэдне разглядаюцца на пасяджэннях органаў Усебеларускага народнага сходу ў адпаведнасці з Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 29. Пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу**

Пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу праводзяцца не радзей як адзін раз на год.

Усебеларускі народны сход можа быць скліканы на пазачарговае пасяджэнне па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, абедзвюх палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (сумесным рашэннем), а таксама па ініцыятыве не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія маюць выбарчае права.

Унясенне адпаведнай ініцыятывы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Законам і іншымі законамі.

Пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу склікаюцца яго старшынёй, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Законам.

Першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу новага склікання адкрывае і да выбрання старшыні Усебеларускага народнага сходу вядзе старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі або яго намеснік.

Рэгістрацыя дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, якія прыбылі на першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу, арганізоўваецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй.

На першым пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу прымаюцца рашэнні

аб выбранні Падліковай камісіі Усебеларускага народнага сходу; аб выбранні старшыні Усебеларускага народнага сходу; аб колькасці наменнікаў старшыні Усебеларускага народнага сходу і колькасці Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу; аб выбранні наменнікаў старшыні Усебеларускага народнага сходу; аб выбранні іншых членаў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу.

Пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу лічыцца правамоцным пры ўмове, што ў ім удзельнічае не менш як дзве трэці ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

Пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу вядзецца беспярэпынна, за выключэннем перапынкаў для адпачынку. Пытанне, уключанае ў парадак дня пасяджэння Усебеларускага народнага сходу, павінна быць разгледжана ў ходзе бягучага пасяджэння.

На пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу могуць быць запрошаны кіраўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, якія не ўвайшлі ў склад Усебеларускага народнага сходу, а таксама асобы, якія ўнеслі значны ўклад у абарону і ўмацаванне дзяржавы і дэмакратычнага грамадства, прымнажэнне эканамічнага, інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу краіны або якія маюць заслугі і дасягненні ў грамадскай, гуманітарнай, дабрачыннай і іншых відах дзейнасці перад дзяржавай і народам.

**Артыкул 30. Рашэнні Усебеларускага народнага сходу**

Усебеларускі народны сход для рэалізацыі ўскладзеных на яго канстытуцыйных функцый у межах сваёй кампетэнцыі прымае рашэнні. Рашэнні Усебеларускага народнага сходу як акты вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, прымаюцца па найважнейшых пытаннях грамадскага і дзяржаўнага жыцця.

Рашэнні Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца абавязковымі для выканання і могуць адмяняць прававыя акты, іншыя рашэнні дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія супярэчаць інтарэсам нацыянальнай бяспекі, за выключэннем актаў судовых органаў.

Рашэнні Усебеларускага народнага сходу прымаюцца адкрытым або тайным галасаваннем.

Тайным галасаваннем прымаюцца рашэнні Усебеларускага народнага сходу аб выбранні старшыні, наменнікаў старшыні Усебеларускага народнага сходу, іншых членаў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу.

Галасаванне на пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу ажыццяўляецца асабіста дэлегатам Усебеларускага народнага сходу шляхам падачы голасу «за» або «супраць».

Рашэнне Усебеларускага народнага сходу лічыцца прынятым пры ўмове, што за яго прагаласавала большасць ад поўнага складу Усебеларускага народнага сходу.

Рашэнні Усебеларускага народнага сходу падлягаюць неадкладнаму ўключэнню ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, афіцыйнаму апублікаванню на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Усебеларускім народным сходам, а таксама могуць быць абнародаваны (апублікаваны) або даведзены да ўсеагульнага ведама іншым спосабам.

Рашэнні Усебеларускага народнага сходу ўступаюць у сілу з дня іх афіцыйнага апублікавання, калі ў гэтых рашэннях не ўстаноўлены іншы тэрмін уступлення іх у сілу.

## ГЛАВА 5 СТАРШЫНЯ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ, ЯГО НАМЕСНІКІ. ПРЭЗІДЫУМ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 31. Старшыня Усебеларускага народнага сходу**

Старшыня Усебеларускага народнага сходу выбіраецца Усебеларускім народным сходам на яго першым пасяджэнні з ліку дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу на тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Усебеларускага народнага сходу ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Усебеларускага народнага сходу:

ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва Усебеларускім народным сходам;

старшынствуе на пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу і яго Прэзідыума;

падпісвае рашэнні Усебеларускага народнага сходу і пастановы яго Прэзідыума;

дае даручэнні органам Усебеларускага народнага сходу і яго Сакратарыяту па пытаннях, якія адносяцца да іх распараджэння;

уносіць пытанні для разгляду Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу;

прадстаўляе Усебеларускі народны сход ва ўзаемаадносінах з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь, іншымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі Рэспублікі Беларусь, а таксама з органамі і арганізацыямі замежных дзяржаў, міжнароднымі арганізацыямі;

арганізоўвае і кантралюе дзейнасць Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу;

выдае распараджэнні па пытаннях, аднесеных да яго кампетэнцыі. Распараджэнні старшыні Усебеларускага народнага сходу могуць быць адменены Усебеларускім народным сходам;

прыводзіць да прысягі суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

мае права ініцыіраваць скліканне з'езда суддзяў Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі і Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Усебеларускага народнага сходу мае наменнікаў.

**Артыкул 32. Намеснікі старшыні Усебеларускага народнага сходу**

Намеснікі старшыні Усебеларускага народнага сходу выбіраюцца Усебеларускім народным сходам на яго першым пасяджэнні з ліку дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу на тэрмін паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу.

Намеснікі старшыні Усебеларускага народнага сходу ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове і з'яўляюцца дзяржаўнымі цывільнымі служачымі.

Паўнамоцтвы наменнікаў старшыні Усебеларускага народнага сходу вызначаюцца Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

Па даручэнні старшыні Усебеларускага народнага сходу намеснікі старшыні Усебеларускага народнага сходу вырашаюць пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю старшыні Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 33. Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу**

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу з'яўляецца пастаянна дзеючым калегіяльным органам, які падсправаздачны Усебеларускаму народнаму сходу і забяспечвае ў парадку, устаноўленым гэтым Законам і Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, аператыўнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзяць у кампетэнцыю Усебеларускага народнага сходу.

Членамі Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца старшыня Усебеларускага народнага сходу, яго намеснікі. Іншыя члены Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу выбіраюцца Усебеларускім народным сходам на яго першым пасяджэнні з ліку дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу.

Найбольшая колькасць Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу складае 15 чалавек.

Пры Прэзідыуме Усебеларускага народнага сходу па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Усебеларускага народнага сходу, могуць ствараецца на грамадскіх пачатках навукова-кансультатыўныя і іншыя дарадчыя органы ў парадку, устаноўленым Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 34. Выбранне старшыні Усебеларускага народнага сходу, яго наменнікаў, іншых членаў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу**

Кандыдатуры на пасады старшыні Усебеларускага народнага сходу, наменнікаў старшыні Усебеларускага народнага сходу, іншых членаў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу вылучаюцца дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу.

Парадак выбрання на пасады, прадугледжаныя часткай першага гэтага артыкула, вызначаецца Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 35. Кампетэнцыя Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу**

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу:

ініцыіруе разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб легітымнасці выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

ініцыіруе разгляд Усебеларускім народным сходам пытання аб увядзенні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнага або ваеннага становішча пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, і ў выпадку бяздзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па гэтых пытаннях;

разглядае пытанне аб папярэднім узгадненні прапанаваных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь кандыдатур для выбрання на пасады старшыні, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, вызвалення іх ад пасады на падставах, прадугледжаных законам;

разглядае пытанне аб папярэднім узгадненні прапанаваных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь кандыдатур для выбрання на пасады старшыні, наменнікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вызвалення іх ад пасады на падставах, прадугледжаных законам;

прысвойвае кваліфікацыйныя класы старшыні, намесніку старшыні і суддзям Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

прысвойвае кваліфікацыйныя класы старшыні, наменнікам старшыні і суддзям Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пазбаўляе іх кваліфікацыйных класаў;

вызначае па прадстаўленні старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь колькасць наменнікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, колькасны і персанальны склад Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

дае папярэднюю згоду на ўзбуджэнне крымінальнай справы ў дачыненні да старшыні, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыні, наменнікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыні і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, народных засядацеляў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прыцягненне іх у якасці падазраванага або абвінавачанага па крымінальнай справе, распачатай у адносінах да іншых асоб альбо па факце ўчыненага злачынства, затрыманне або прымяненне да іх іншых мер працэсуальнага прымусу, звязаных з пазбаўленнем асабістай свабоды;

разглядае пытанне аб прыпыненні паўнамоцтваў старшыні, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыні, наменнікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у выпадку ўзбуджэння ў дачыненні да іх крымінальнай справы, прыцягнення іх у якасці падазраванага або абвінавачанага па крымінальнай справе, распачатай у адносінах да іншых асоб або па факце ўчыненага злачынства, затрымання або прымянення да іх іншых мер працэсуальнага прымусу, звязаных з пазбаўленнем асабістай свабоды, а таксама аб аднаўленні іх паўнамоцтваў у выпадку, калі адпалі названыя падставы для прыпынення паўнамоцтваў;

разглядае па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пытанне аб спыненні адстаўкі старшыні, намесніка старшыні і суддзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыні, наменнікаў старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь на падставах, прадугледжаных законам;

разглядае пытанне аб папярэднім узгадненні прапанаваных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь кандыдатур для выбрання на пасады старшыні і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі, вызвалення іх ад пасады на падставах, прадугледжаных законам;

разглядае пытанне аб папярэднім узгадненні прапанаванай старшынёй Цэнтральнай выбарчай камісіі кандыдатуры намесніка старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі;

прысвойвае клас дзяржаўнага цывільнага служачага старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі;

разглядае пытанне аб папярэднім узгадненні рашэння Цэнтральнай выбарчай камісіі аб ускладанні абавязкаў часова адсутнага намесніка старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі на іншага яе члена;

звяртаецца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з прапановай аб дачы заключэння:

аб тлумачэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, аб адпаведнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь законаў, указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, нарматыўных прававых актаў іншых дзяржаўных органаў;

аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

аб канстытуцыйнасці правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

арганізоўвае кантроль за выкананнем рашэнняў Усебеларускага народнага сходу і пастаноў яго Прэзідыума непасрэдна або праз Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу;

дае абавязковыя для выканання даручэнні дзяржаўным органам і службовым асобам, атрымлівае ад іх інфармацыю, неабходную для рэалізацыі ўскладзеных на яго паўнамоцтваў;

дае Сакратарыяту Усебеларускага народнага сходу даручэнні па пытаннях, звязаных з правядзеннем пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу, і іншых пытаннях, якія адносяцца да яго распараджэння;

уносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прадстаўленні аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, аднесеныя да яго кампетэнцыі Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі і Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

Прапанова аб дачы заключэння па пытаннях, указаных у абзацах сямнаццатым — дзевятнаццатым часткі першай гэтага артыкула, уносіцца ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам аб канстытуцыйным судаводстве.

У выпадку ўнясення ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прапановы аб дачы заключэння па пытанні, указаным у абзацы дзевятнаццатым часткі першай гэтага артыкула, Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу адначасова інфармуе аб гэтым Цэнтральную выбарчую камісію.

**Артыкул 36. Пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу**

Пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу праводзяцца не радзей як адзін раз у шэсць месяцаў.

Пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу склікаюцца старшынёй Усебеларускага народнага сходу.

Пасяджэнне Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу лічыцца правамоцным пры ўмове, што ў ім удзельнічае не менш як дзве трэці ад поўнага складу Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 37. Рашэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу**

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу для рэалізацыі ўскладзеных на яго канстытуцыйных функцый прымае рашэнні ў форме пастаноў.

Пастанова Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу лічыцца прынятай пры ўмове, што за яе прагаласавала большасць ад поўнага складу Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу.

Пры роўнасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас старшынствуючага.

Пастановы Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу могуць быць адменены Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу і Усебеларускім народным сходам.

Пастановы Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу падлягаюць абнародаванню (апублікаванню) па рашэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу ў парадку, устаноўленым Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

## ГЛАВА 6 ПРАВАВЫ СТАТУС ДЭЛЕГАТА УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ. СПЫНЕННЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ ДЭЛЕГАТА УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 38. Дэлегат Усебеларускага народнага сходу. Правы і абавязкі дэлегата Усебеларускага народнага сходу**

Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу могуць быць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам. Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу не маюць права мець грамадзянства (падданства) іншай дзяржавы і (або) дакументы замежных дзяржаў, якія даюць правы на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю.

Дэлегат бярэ ўдзел у рабоце Усебеларускага народнага сходу без адрыву ад працоўнай (службовай) дзейнасці, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам. Дэлегат вызваляецца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў па месцы работы (службы) на час ажыццяўлення ім сваіх паўнамоцтваў.

На пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу дэлегаты на аснове калектыўнага, раўнапраўнага і свабоднага абмеркавання разглядаюць і вырашаюць пытанні, аднесеныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі законамі да кампетэнцыі Усебеларускага народнага сходу.

Дэлегат Усебеларускага народнага сходу мае права:

атрымліваць ад дзяржаўных органаў, іншых арганізацый і службовых асоб інфармацыю і (або) растлумачэнні па пытаннях, аднесеных да кампетэнцыі Усебеларускага народнага сходу, а таксама звязаных з дзейнасцю дэлегата Усебеларускага народнага сходу;

вывучаць грамадскую думку, праводзіць сустрэчы з насельніцтвам і працоўнымі калектывамі, іншым спосабам даводзіць да грамадскасці інфармацыю аб дзейнасці Усебеларускага народнага сходу і яго органаў, а таксама аб рашэннях Усебеларускага народнага сходу;

уносіць у парадку, устаноўленым Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, прапановы для разгляду на пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу і яго органаў.

Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі і службовыя асобы садзейнічаюць дэлегату Усебеларускага народнага сходу ў рэалізацыі ім сваіх паўнамоцтваў.

Гарантыі для работнікаў на час выканання імі абавязкаў дэлегата Усебеларускага

народнага сходу ўстанаўліваюцца заканадаўствам аб працы.

Расходы па праездзе да месца правядзення пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу і назад, найме жылога памяшкання, за пражыванне па-за месцам жыхарства (сутачныя) кампенсуюцца дэлегату Усебеларускага народнага сходу ў парадку і памерах, устаноўленых заканадаўствам для работнікаў, якія накіроўваюцца ў службовыя камандзіроўкі.

Дэлегат Усебеларускага народнага сходу абавязаны ўдзельнічаць у пасяджэннях Усебеларускага народнага сходу і рабоце яго органаў, членам якіх ён з'яўляецца. Невыкананне дэлегатам указанага абавязку без уважлівых прычын з'яўляецца падставай для пазбаўлення яго ўстаноўленых законам гарантый.

**Артыкул 39. Спыненне паўнамоцтваў дэлегата Усебеларускага народнага сходу**

Паўнамоцтвы дэлегата Усебеларускага народнага сходу спыняюцца пасля заканчэння паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу.

Паўнамоцтвы дэлегата Усебеларускага народнага сходу спыняюцца датэрмінова ў выпадку:

смерці дэлегата;

прызнання дэлегата судом недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным;

спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь, а таксама набыцця грамадзянства (падданства) іншай дзяржавы;

атрымання ад замежных дзяржаў дакументаў, якія даюць правы на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю;

учынення злачынства, вызначанага прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу;

пісьмовай заявы дэлегата аб складанні ім сваіх паўнамоцтваў з прычыны іншых абставін, якія перашкаджаюць іх ажыццяўленню, у тым ліку па стане здароўя.

Паўнамоцтвы дэлегата Усебеларускага народнага сходу спыняюцца датэрмінова таксама ў выпадку:

датэрміновага вызвалення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад пасады або зняцця Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з пасады на падставах, прадугледжаных законам, — для дэлегата Усебеларускага народнага сходу, які з'яўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

спынення паўнамоцтваў дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на іншых падставах, прадугледжаных законам, — для дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад заканадаўчай улады;

вызвалення дэлегата ва ўстаноўленым парадку ад пасады, якая дае права быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу, — для дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад выканаўчай улады;

спынення паўнамоцтваў суддзі на іншых падставах, прадугледжаных законам, — для дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад судовай улады;

спынення паўнамоцтваў дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў на іншых падставах, прадугледжаных законам, — для дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў;

спынення членства ў суб'екце грамадзянскай супольнасці (арганізацыі, якая ўваходзіць у склад суб'екта грамадзянскай супольнасці) на іншых падставах, прадугледжаных законам, — для дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад грамадзянскай супольнасці.

Палажэнні часткі трэцяй гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, выбраных старшынёй або намеснікамі старшыні Усебеларускага народнага сходу.

Аб надыходзе абставін, указаных у частках другой і трэцяй гэтага артыкула, дэлегат Усебеларускага народнага сходу або орган (арганізацыя), прадстаўніком якога з'яўляецца дэлегат Усебеларускага народнага сходу, неадкладна паведамляюць Прэзідыуму Усебеларускага народнага сходу.

У выпадку датэрміновага спынення паўнамоцтваў дэлегата Усебеларускага народнага сходу, выбранага ад мясцовага Савета дэпутатаў або суб'екта грамадзянскай супольнасці, могуць праводзіцца выбары новага дэлегата Усебеларускага народнага сходу адпаведна ад мясцовага Савета дэпутатаў таго ж узроўню або таго ж суб'екта грамадзянскай супольнасці.

У выпадку датэрміновага спынення паўнамоцтваў дэлегата Усебеларускага народнага сходу, выбранага ад мясцовага Савета дэпутатаў або суб'екта грамадзянскай супольнасці, менш як за год да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу выбары новага дэлегата замест выбыўшага не праводзяцца.

**Артыкул 40. Пасведчанне і нагрудны знак дэлегата Усебеларускага народнага сходу**

Дэлегату Усебеларускага народнага сходу на перыяд ажыццяўлення ім сваіх паўнамоцтваў выдаюцца пасведчанне, якое з'яўляецца дакументам, што пацвярджае яго прававы статус, і нагрудны знак.

Форма пасведчання дэлегата Усебеларускага народнага сходу, а таксама палажэнне аб нагрудным знаку дэлегата Усебеларускага народнага сходу, яго апісанне і выява зацвярджаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Парадак выдачы пасведчання і нагруднага знака дэлегата Усебеларускага народнага сходу ўстанаўліваецца Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу.

## ГЛАВА 7
## ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

**Артыкул 41. Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу**

Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу з'яўляецца рабочым органам Усебеларускага народнага сходу і дзейнічае на аснове палажэння, якое зацвярджаецца Усебеларускім народным сходам.

У сваёй дзейнасці Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі актамі заканадаўства, Рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, а таксама рашэннямі Усебеларускага народнага сходу, пастановамі Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, распараджэннямі старшыні Усебеларускага народнага сходу.

Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу ўзначальвае начальнік Сакратарыята, які прызначаецца на дзяржаўную грамадзянскую пасаду і вызваляецца ад пасады Прэзідыумам Усебеларускага народнага сходу па прадстаўленні старшыні Усебеларускага народнага сходу.

Работнікі Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу, за выключэннем асоб, якія ажыццяўляюць забеспячэнне дзейнасці і тэхнічнае абслугоўванне, з'яўляюцца дзяржаўнымі цывільнымі служачымі.

Пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу Сакратарыят Усебеларускага народнага сходу працягвае сваю дзейнасць.

**Артыкул 42. Матэрыяльна-тэхнічнае і сацыяльна-бытавое забеспячэнне, фінансаванне дзейнасці Усебеларускага народнага сходу**

Фінансаванне дзейнасці Усебеларускага народнага сходу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з каштарысам расходаў у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Усебеларускага народнага сходу.

Каштарыс расходаў Усебеларускага народнага сходу складаецца штогод і зацвярджаецца рашэннем Усебеларускага народнага сходу.

Матэрыяльна-тэхнічнае і сацыяльна-бытавое забеспячэнне дзейнасці Усебеларускага народнага сходу ажыццяўляецца Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 43. Унясенне змяненняў у законы**

1. Пункт 2 часткі трэцяй артыкула 101 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. пасля слова «ажыццяўлення» дапоўніць словамі «паўнамоцтваў дэлегата Усебеларускага народнага сходу,».

2. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 301-З «Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь» наступныя змяненні:

частку другую артыкула 4 пасля слоў «Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «старшыні Усебеларускага народнага сходу,»;

у частцы першай артыкула 5:

пасля абзаца другога дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«на будынку Усебеларускага народнага сходу — пастаянна;»;

з абзаца шостага слова «дзяржаўных» выключыць;

з абзаца сёмага слова «устаноў» выключыць;

у абзацы восьмым слова «сёмым» замяніць словам «восьмым»;

у абзацы дваццатым:

пасля слоў «кабінетах старшыні» і «памяшканнях пасяджэнняў» дапоўніць абзац адпаведна словамі «Усебеларускага народнага сходу, старшыні» і «Усебеларускага народнага сходу,»;

словы «дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных» замяніць словамі «арганізацый, падпарадкаваных»;

словы «начальнікаў галоўных упраўленняў Нацыянальнага банка па абласцях,» выключыць;

артыкул 8 пасля часткі другой дапоўніць часткай наступнага зместу:

«Выява Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь змяшчаецца на ідэнтыфікацыйнай картцы грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, біяметрычным пасведчанні на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна, біяметрычным пасведчанні на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь асобы без грамадзянства.»;

у частцы першай артыкула 10:

у абзацы другім:

пасля слоў «Рэспублікі Беларусь, на будынках» дапоўніць абзац словамі «Усебеларускага народнага сходу,»;

словы «дзяржаўных арганізацый» замяніць словам «арганізацый»;

у абзацы трэцім:

пасля слоў «Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,» і «памяшканнях пасяджэнняў» дапоўніць абзац адпаведна словамі «старшыні Усебеларускага народнага сходу,» і «Усебеларускага народнага сходу,»;

словы «дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных» замяніць словамі «арганізацый, падпарадкаваных»;

словы «начальнікаў галоўных упраўленняў Нацыянальнага банка па абласцях,» выключыць;

у абзацы чацвёртым:

пасля слоў «Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць абзац словамі «Усебеларускага народнага сходу,»;

словы «дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных» замяніць словамі «арганізацый, падпарадкаваных»;

абзац дзявяты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«на пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, дыпламатычным пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, службовым пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, пасведчанні на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанні бежанца, пасведчанні на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь, нацыянальным пасведчанні асобы марака Рэспублікі Беларусь, праязным дакуменце Рэспублікі Беларусь, біяметрычным пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, біяметрычным дыпламатычным пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, біяметрычным службовым пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, біяметрычным праязным дакуменце Рэспублікі Беларусь, праязным дакуменце (Канвенцыя ад 28 ліпеня 1951 года);»;

у частцы першай артыкула 12:

пасля абзаца другога дапоўніць частку абзацам наступнага зместу:

«пры адкрыцці і закрыцці пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу;»;

абзац дзявяты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«пры правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў, у тым ліку ў дні пачатку і заканчэння навучальнага года, ва ўстановах адукацыі.».

3. Абзац другі пункта 2 артыкула 11 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 г. № 225-З «Аб рэкламе» пасля слоў «Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «старшыні Усебеларускага народнага сходу,».

4. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З «Аб барацьбе з карупцыяй» наступныя змяненні:

у артыкуле 1:

абзацы трэці і чацвёрты пасля слоў «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь,» дапоўніць словамі «старшыня Усебеларускага народнага сходу,»;

абзац пяты пасля слова «асобы), —» дапоўніць словамі «дэлегаты Усебеларускага народнага сходу (за выключэннем старшыні Усебеларускага народнага сходу і яго намеснікаў),»;

абзац сёмы дапоўніць словамі «, старшыня, намеснік старшыні і суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыня, намеснікі старшыні і суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі»;

абзац чацвёрты часткі трэцяй артыкула 10 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«дэлегатам Усебеларускага народнага сходу, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў, — адпаведна Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу, Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў.»;

частку другую артыкула 16 пасля слоў «кандыдата на пасаду дзяржаўнай службовай асобы» дапоўніць словамі «, ва ўнясенні прапановы аб выбранні на пасаду дзяржаўнай службовай асобы»;

частку другую артыкула 29 дапоўніць словамі «або ўнясення прапановы аб яго выбранні на такую пасаду»;

у артыкуле 31:

абзац чацвёрты часткі першай выключыць;

частку другую пасля слова «прызначаныя» дапоўніць словам «(выбраныя)».

5. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 307-З «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці» наступныя змяненні:

у абзацы трэцім часткі другой і абзацы шостым часткі трэцяй артыкула 10, абзацы восьмым часткі першай артыкула 11 словы «дзеянні органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць,» замяніць словамі «рашэнні, дзеянні (бяздзейнасць) органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, і іх службовых асоб»;

частку першую артыкула 36 пасля слова «дачыненні» дапоўніць словамі «старшыні Усебеларускага народнага сходу,»;

частку пятую артыкула 51 пасля слова «кантракце» дапоўніць словамі «дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу,».

6. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 2022 г. № 175-З «Аб дзяржаўнай службе» наступныя змяненні:

пункт 3 артыкула 8 пасля слова «пасады» дапоўніць словамі «старшыні Усебеларускага народнага сходу,»;

у пункце 2 артыкула 14:

падпункт 2.1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«2.1. Усебеларускі народны сход і яго Сакратарыят;»;

дапоўніць пункт падпунктам $2.1^{1}$ наступнага зместу:

«$2.1^{1}$. Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і іх сакратарыяты;»;

у артыкуле 38:

з падпункта 1.10 пункта 1 словы «па выкананні абмежаванняў» выключыць;

дапоўніць артыкул заўвагай наступнага зместу:

«Заўвага. Для мэт гэтага Закона тэрмін «сваякі» прымяняецца ў значэнні, вызначаным Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З «Аб барацьбе з карупцыяй».»;

артыкул 44 дапоўніць пунктам $4^{1}$ наступнага зместу:

«$4^{1}$. У выпадках і пры ўмовах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, допускаецца часовы перавод цывільнага служачага з яго пісьмовай згоды ў іншы дзяржаўны орган.».

**Артыкул 44. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона**

Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сумесна з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 лістапада 2023 г. забяспечыць падрыхтоўку і ўнясенне на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

праекта нарматыўнага прававога акта аб утварэнні Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу і зацвярджэнні палажэння аб ім;

прапаноў аб устанаўленні штатнай колькасці Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу.

Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да 1 снежня 2023 г. унесці на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прапановы аб прызначэнні кіраўніцтва Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу, а таксама забяспечыць кантроль за фарміраваннем кадравага саставу Сакратарыята Усебеларускага народнага сходу.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Сакратарыяту Усебеларускага народнага сходу распрацаваць і ўнесці для разгляду на першым пасяджэнні Усебеларускага народнага сходу Часовы рэгламент Усебеларускага народнага сходу.

**Артыкул 45. Пераходныя палажэнні**

Першае пасля ўступлення ў сілу гэтага Закона пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу праводзіцца ў адпаведнасці з Часовым рэгламентам Усебеларускага народнага сходу, які зацвярджаецца Усебеларускім народным сходам.

Нарматыўныя прававыя акты, прынятыя па пытаннях, указаных у частцы першай артыкула 44 гэтага Закона, дзейнічаюць да прыняцця Усебеларускім народным сходам рашэнняў па адпаведных пытаннях.

**Артыкул 46. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

артыкулы 1 — 11 — з 1 студзеня 2024 г.;

артыкулы 12 — 42, пункт 1, абзацы другі, чацвёрты, пяты, восьмы, дзясяты, сямнаццаты, дваццаты, дваццаць чацвёрты, дваццаць дзявяты і трыццаты пункта 2, пункты 3 і 4, абзацы трэці і чацвёрты пункта 5, абзацы другі — сёмы пункта 6 артыкула 43 — з дня фарміравання Усебеларускага народнага сходу ў парадку, устаноўленым гэтым Законам;

іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

*7 лютага 2023 г.,*
*г. Мінск*
*№ 248-З*

* *Неафіцыйны пераклад.*

*Афіцыйнае апублікаванне на сайце Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.*

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

## Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца




Помнік «Смуткуючая маці» ў Любані.

# ЯК ПТУШКІ ФЕНІКС

### Пасля вайны Любаншчына не далічылася толькі адной вёскі. Астатнія — адрадзіліся, паўсталі з попелу

**ПА ўдакладненых звестках Генеральнай пракуратуры, у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Любанскага раёна акупанты і іх памагатыя знішчылі 72 населеныя пункты. 27 вёсак згарэлі поўнасцю. Не адрадзіўся толькі Савалуцк. Аднак любанскай Хатынню населены пункт не назавеш — у вогнішчы, якое пераўтварыла вёску ў суцэльнае папялішча, не загінуў ні адзін чалавек.**

У нейкай ступені жыхарам Любаншчыны, калі можна так сказаць, пашанцавала. Тут няма ні сваіх Борак, ні Алы, ні Дальвы... Такога, каб людзей масава заганялі ў хаты і зажыва палілі, на шчасце, не было. Аднак магло быць, калі б не партызаны. Практычна аб усіх карных акцыях фашыстаў народныя мсціўцы, якіх у партызанскім краі было багата, папярэджвалі мясцовых жыхароў. Тыя, у сваю чаргу, партызанам давяралі і своечасова сыходзілі ў лес. Калі ў вёскі прыходзілі немцы і іх памагатыя, а адбывалася гэта на працягу ўсёй вайны, то людзей у хатах, як правіла, не было. У вёсках заставаліся або старыя, або хворыя... Распраўляліся тады з тымі, хто ёсць. Хат, небагатай маёмасці людзей, якую яны нажывалі гадамі, вядома, не шкадавалі.

Выявіўшы вёскі пустымі, карнікі знаходзілі іншыя спосабы, як расправіцца з людзьмі. У прыватнасці, арганізавалі гета, дзе ў адзін дзень — 4 снежня 1941 года — пазбавілі жыцця 770 чалавек. Па апошніх звестках, за гады акупацыі ў Любанскім раёне нацыстамі было забіта і закатавана каля 3700 мірных грамадзян, звыш 1800 жыхароў вывезлі на прымусовыя работы ў Германію.

### «ВОГНЕННЫЯ» КРОПКІ НА КАРЦЕ

Як гітлераўцы здзекаваліся з мясцовых жыхароў у гады вайны, распавядае адна з экспазіцый Любанскага музея народнай славы. Супрацоўнікі музея стварылі карту спаленых вёсак раёна. Удакладнялі «вогненныя» кропкі на ёй і па звестках Нацыянальнага архіва, і па ўспамінах сведак карных акцый гітлераўцаў. Карта сведчыць: у гады акупацыі гарэлі ледзь ці не ўсе населеныя пункты Любаншчыны. Некаторыя — і не адзін раз.

— Як правіла, населеныя пункты знішчаліся падчас карных аперацый супраць мірнага насельніцтва партызанскай зоны, — адзначае **дырэктар Любанскага музея народнай славы Наталля СІНЯК.** — Не ўлічваючы тых баёў, якія вяліся на нашай тэрыторыі пастаянна, на Любаншчыне былі праведзены тры карныя аперацыі. Усе — вясной: у 1942-м, 1943-м і 1944-м гадах.

Аб злачынствах фашыстаў, якія здзяйсняліся на любанскай зямлі з сумнай перыядычнасцю, сведчаць рэдкія фотаздымкі. У той час, як некаторыя музеі ў іншых рэгіёнах краіны могуць пахваліцца багатым фотаархівам на тэму генацыду, у Любанскім музеі народнай славы падчас стварэння экспазіцыі абапіраліся ў асноўным на ўспаміны відавочцаў. Дырэктар музея заўважае, што на практычную адсутнасць ілюстрацыйнага матэрыялу хутчэй за ўсё паўплываў той факт, што свайго фотаатэлье ў Любані не было — ні да вайны, ні, зразумела, падчас акупацыі. Як высветлілася, нават карнікі не фатаграфавалі свае злачынныя дзеянні на тэрыторыі раёна — такую выснову дазваляюць рабіць пошукі фотадоказаў у многіх архівах краіны і не толькі.

Невялікая колькасць фотаздымкаў, якія сведчаць аб генацыдзе ў адносінах да мірнага насельніцтва на Любаншчыне, датуецца толькі 1943 годам. «У параўнанні з 1942 годам Любанскі раён практычна поўнасцю кантраляваўся партызанамі, — удакладняе Наталля Сіняк. — Сюды і самалёты прыляталі, і фатографы прыязджалі, і кінафільмы паказвалі, і школы працавалі — адным словам, было абсалютна іншае жыццё».

### УРОКІ ПАМЯЦІ

Музейная выстаўка, якая распавядае аб генацыдзе на Любаншчыне, падарожнічае па раёне. Яна ўжо пабывала і ў навучальных установах, і на прадпрыемствах. Нямногія, нават сярод дарослых людзей, ведаюць усю праўду аб тых падзеях і ўсведамляюць маштаб трагедыі, якая напаткала любанскую зямлю ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Таму людзі ўдзячныя, што цяпер у іх з'явілася магчымасць, нават не сыходзячы са свайго працоўнага месца, больш падрабязна азнаёміцца з трагічнай старонкай гісторыі Любанскага раёна.

Гэтымі днямі экспазіцыя прадстаўлена для навучэнцаў сярэдняй школы № 1 Любані. З такой нагоды ў школе праводзяцца тэматычныя ўрокі, на якіх супрацоўнік Любанскага музея народнай славы расказвае дзецям аб тым, якімі подзвігамі і трагедыямі жыў раён у гады нямецка-фашысцкай акупацыі.

— Кожны павінен дасканала ведаць сваю гісторыю: той, хто не ведае гісторыі, не мае будучыні, — заўважае **дырэктар сярэдняй школы № 1 Любані Сяргей ШАПЕЛЬ.** — Я гэта ведаю з уласнага жыцця. Бацька мне расказваў пра пачатак вайны, пра тое, з якой радасцю яны сустракалі пасля Перамогу. На вачах слёзы выступалі, калі ён распавядаў пра сваё дзяцінства. Пачынаючы з 4 класа, калі дзеці ўжо цікавяцца гісторыяй, знаёмяцца з ёй ужо больш асэнсавана, яны павінны ведаць не толькі ключавыя даты, а і гісторыю свайго роднага краю. Я звярнуўся да кіраўніцтва музея і папрасіў тут, на месцы, арганізаваць сустрэчы, на якіх дзеці не з вуснаў настаўніка гісторыі, а супрацоўніка музея могуць пачуць, што сапраўды адбывалася на тэрыторыі Любанскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля такіх урокаў памяці школьнікі падыходзяць да экспазіцыі па генацыдзе і спрабуюць адшукаць на ёй знаёмыя назвы. За адну з іх міжволі чапляюцца і вочы дырэктара. Серадзібар. Дата знішчэння — красавік 1944 года. Пасля вайны вёска стала называцца Канстанцінаўкай.

«Гэта вёска майго бацькі, — звяртае ўвагу Сяргей Шапель. — Як сведчыць назва, знаходзілася яна сярод лесу. Людзі жылі мірна, але гэта не ўратавала вёску. Маці родам з суседняй вёскі Кузьмічы, якую таксама часткова спалілі акупанты. Мама мая тады была яшчэ немаўлём. На шчасце, змагла ўцалець. Чаго не скажаш аб яе двух родных братах. Колькі ні езджу, дагэтуль не магу знайсці месца іх пахавання. Ведаю, што за сувязь з партызанамі дзядзькі былі забітыя фашыстамі ў раёне вёскі Малыя Гарадзяцічы».




Дакументальная выстаўка пра генацыд насельніцтва Любанскага раёна ў 1941—1944 гадах разгорнута ў сярэдняй школе № 1 раённага цэнтра.

### САВАЛУЦКАЯ ГРУША

У самым пачатку вайны на Любаншчыне былі спалены вёскі Чабусы (згарэла 208 хат) і Камуна (210 хат пераўтварыліся ў попел).

**Кніга «Памяць» Любанскага раёна. З успамінаў жыхаркі в. Камуна А. Шыкуновай (Адзярыхі):**



Лідзія БАБКО і Кацярына ВЯЛІЧКА ведаюць пра трагічныя падзеі часоў мінулай вайны ад сваіх бацькоў і старэйшых сваякоў.

*«Акупанты паказалі свой звярыны твар з першых дзён з'яўлення ў Камуне, назва якой асацыіравалася, відаць, з самым ненавісным для іх словам «камунізм». У пачатку ліпеня гітлераўцы прыехалі з Любані на некалькіх машынах у нашу вёску. Пачалі з гвалту і рабаўніцтва. Забіралі з хат самае каштоўнае і патрэбнае, выганялі з хлявоў жывёлу. Тое, што не маглі забраць і вывезці, аблілі бензінам і падпалілі. Запалілі і асобныя хаты. Ворагі ўжо ад'язджалі, калі здарылася нечаканае: з хмызнякоў нехта кінуў у калону машын гранату. Гітлераўцы раз'юшыліся, вярнуліся, сагналі з вёскі жыхароў у будынак МТС і збіраліся ўсіх знішчыць. На шчасце, у Камуне яшчэ з часоў мінулай вайны было некалькі сем'яў немцаў, якія ведалі родную мову. Яны здолелі пераканаць фашысцкае начальства, што рабіць злачынства нельга. Над людзьмі злітаваліся, але вёску спалілі амаль поўнасцю, ацалела толькі некалькі хат наводшыбе каля лесу».*

Падчас першай карнай аперацыі пад кодавай назвай «Бамберг», якая пачалася ў сакавіку 1942 года, супраць партызан і мірных жыхароў былі накіраваны тры пяхотныя і адзін артылерыйскі палкі, два асобныя батальёны паліцыі, кавалерыйскі эскадрон і авіяэскадрылля. У першы дзень наступлення карнікі расстралялі і павесілі каля 300 чалавек, спалілі Савалуцк, Ямінск, Палічнае.

Савалуцк — адзіная з вогненных вёсак Любаншчыны, якая пасля вайны не адрадзілася. Трагедыя здарылася тут у маі 1942 года. У суседняй вёсцы Азярное знаходзіўся штаб 258-й партызанскай брыгады. Партызаны папярэдзілі жыхароў лясной вёскі аб чарговай карнай аперацыі немцаў. Людзі пакінулі свае хаты, пайшлі ў лес, схаваліся ў куранях, якія самі ж дагэтуль змайстравалі. А вось выратаваць вёску не змаглі — усе 13 хат згарэлі ў агні.

— Жыхары Савалуцка, якія перажылі вайну, перасяліліся ў суседнія вёскі, дзе засталося па некалькі хат, — расказвае **настаўнік грамадазнаўства Сароцкай сярэдняй школы Любанскага раёна, краязнаўца Анатоль ВЯЛІЧКА.** — Аднаўляць сваю вёску не хапіла сілы. Ды і не было каму. Хто ў асноўным застаўся? Жанчыны ды дзеці. Нягледзячы на тое, што тут ужо даўно не жывуць людзі, сцежка сюды не зарастае. Да памятнага знака — гэта адзінае, што нагадвае аб тым, што некалі тут была вёска, — з экскурсіяй, а таксама ў рамках памятных мерапрыемстваў прыязджаюць як дзеці, так і дарослыя.

Гэта стала магчымым дзякуючы ганароваму грамадзяніну Любанскага раёна, найбольш яркаму прадстаўніку беларускай лясной навукі Аляксандру Мацвейку, які разам з мясцовымі ўладамі вырашыў увекавечыць памяць сваёй вёскі. Памятны знак быў адкрыты падчас мітынгу 2 ліпеня 2005 года. З гэтай нагоды Анатоль Вялічка напісаў верш:






У Любанскім музеі народнай славы. З матэрыяламі пра спаленыя вёскі знаёміць старшы навуковы супрацоўнік музея Антаніна СІМАНАВА.

*У нашым Любанскім краі*
*Савалуцк бы Хатынь.*
*Яе вогненных вёсак*
*Я ў вайну напаткаў.*
*Сярод хат тых згарэлых*
*Камень памяці стаў.*

Яшчэ адным напамінам аб тым, што некалі тут, сярод лесу, жылі людзі, выхоўвалі дзяцей, з'яўляецца невялікая груша-дзічка, якая расце каля памятнага знака. Дрэва — сведка трагедыі вёскі. Нягледзячы на пажар, які разгарэўся тут вясной 1942 года, яно выжыла. Аб тым, як напакутаваліся ў вайну жыхары вёскі, сведчыць сухая палова дрэва. Аднак, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, жыццё людзей, хоць і не ў Савалуцку, але працягнулася — гэта сімвалізуе другая палова грушы, якая кожнай вясной зелянее і квітнее. А побач з дрэвам маладняк расце. Так і ў жыцці атрымалася: у людзей, якія павінны былі загінуць, з'явіліся нашчадкі.

### ПАД ПОКРЫВАМ ЛЕСУ

У жніўні 1942 года з мэтай ачысткі раёна дзеяння партызан Акцябрска-Любанскай зоны былі спалены вёскі Верачагошч і Рэдкавічы (са 151 хаты ўцалелі толькі дзевяць). У верасні 1942 года гітлераўцы часткова знішчылі вёску Мардзвілавічы.

**Кніга «Памяць» Любанскага раёна. З успамінаў Марыі Шаплыкі (жыхаркі вёскі Сарачы), да вайны жыла ў Рэдкавічах:**

*«Наша хата стаяла наводшыбе, была абсаджана кустамі. Партызаны заўсёды нам перадавалі, калі едуць карнікі, а мы папярэджвалі ўсіх вяскоўцаў. Звычайна я, старэйшая — мне было ўжо шэсць гадоў, — бегла да найбліжэйшай хаты. Людзі хуценька збіралі клункі з самым неабходным — і ў лес. Напярэдадні вайны маці нарадзіла хлопчыка, з-за яго аднавяскоўцы ніколі не бралі нас з сабой: маўляў, будзе крычаць, усіх выдасць. Бацька быў у партызанах, мама адна з трыма малымі вымушана была хавацца. Аднойчы мы начавалі ў нейкай канаве, было цёмна, холадна, пад нагамі хлюпала гразь. Страшна: калыхне вецер куст — здаецца, немцы ідуць. Маленькі плача... Мама ўзяла хусцінку і заткнула яму рот. Так і сядзелі, пакуль не развіднела. Кожны раз, вярнуўшыся ў вёску, мы не далічваліся адной ці дзвюх хат. Спачатку фашысты палілі пабудовы, што стаялі на ўскраіне, а ў 1942-м ператварылі ў попел амаль усе Рэдкавічы. Згарэла і наша хата разам з усім скарбам. Суседка дала нам такую-сякую вопратку, і мы падаліся ў Верачагошч, дзе жылі родзічы. Але хутка немцы дабраліся і сюды. Жыхары вымушаны былі перасяліцца ў лес. Амаль год туліліся ў зямлянках, па некалькі сем'яў у кожнай».*



Анатоль ВЯЛІЧКА каля мемарыяльнага каменя ў памяць спаленай вёсцы Савалуцк.

Мірныя жыхары, якіх партызаны папярэджвалі аб карных аперацыях гітлераўцаў, наспех пакідалі свае хаты. Людзі ўжо прызвычаіліся пастаянна жыць у трывозе і гатоўнасці па першым сігнале хавацца ў лесе. «У мяне заўсёды стаялі напагатове калёсы, — успамінаў жыхар вёскі Старасек І. Дайнека. — Як толькі аб'яўлялі трывогу, я адразу запрагаў каня, браў самае неабходнае — адзенне, прадукты і з усёй сям'ёй спяшаўся ў лес, дзе ў самых глухіх месцах загадзя былі падрыхтаваны сховішчы. Так, у трывозе і страху вандравалі ўсю вайну...»

У карнай аперацыі «Русалка», якая праводзілася супраць партызан і мірнага насельніцтва Любанскага і іншых раёнаў вясной 1943 года, былі задзейнічаны каля 20 ахоўных батальёнаў, авіяцыя, дапаможныя сілы паліцыі, нават падраздзяленні вермахта. У барацьбе з партызанамі істотных поспехаў нацысты не дабіліся, таму вырашылі пераключыцца на мірных жыхароў. Карнікі 25-га ахоўнага батальёна расстралялі 695 бязвінных людзей: жанчын, старых і дзяцей. Больш як тысяча маладых людзей была схоплена і вывезена на прымусовыя работы ў Германію. Падчас аперацыі нацысты знішчылі вёскі Пагной, Дворышча, Малыя Гарадзяцічы, Прыклінец, Абоз. Часткова былі спалены Вялікія Гарадзяцічы і Дварэц.

### ТРАГЕДЫЯ Ў ДВАРЦЫ

Жыхары ваеннага Дварца (тады населены пункт называўся Шостая брыгада) дагэтуль жывуць у сваёй вёсцы. Летась Ніна і Аляксандр Ахрамейкі адсвяткавалі 60-годдзе сумеснага жыцця. Калі карнікі палілі вёску, Ніна Раманаўна была яшчэ малая — гадкоў пяць усяго. Аляксандру Маркавічу на момант трагедыі было дзевяць, таму вайну, калі і хацеў бы забыць, не можа...

Яго бацька памёр да вайны. Маці адна выхоўвала шасцярых дзяцей: у сям'і раслі пяцёра хлопцаў і адна дзяўчына. Жыццё і так было няпростае. Калі ж пачалася вайна, стала яшчэ цяжэй: галоўных карміцеляў, двух старэйшых сыноў, забралі на фронт.

— Партызаны знаходзіліся ў кожнага на кватэры, жылі яны і ў нас, — успамінае Аляксандр Маркавіч. — Вядома, хто ж хацеў чужых людзей прымаць у хату? Але хочаш — не хочаш, а трэба. Аднойчы ўсім жыхарам вёскі было сказана пакідаць хаты і хавацца ў лесе. Так усе і зрабілі. Там пабудавалі зямлянкі. І мы, дзеці, з мамай (я быў самы малодшы) пабудавалі прыстанішча з галін і хвойных лапак. Так і жылі некаторы час, пакуль на тыф не захварэў брат Фёдар. Ён быў вельмі добрым шаўцом: у свае 14-15 гадоў рамантаваў партызанам адзенне, абутак.

Маці разам з хворым сынам вымушана была вярнуцца ў вёску — у хаце ўсё ж цяплей. З імі пайшоў і Саша. Пераначавалі толькі ноч. «На наступны дзень — зноў трывога, трэба было ўцякаць у лес, а брату стала яшчэ горш: Федзя ўжо не мог ісці, — расказвае сведка тых падзей. — Мы з мамай пайшлі шукаць каня, каб завесці хворага брата ў лес. Каня знайшлі хутка, а запрэгчы яго ў павозку ў мамы не атрымалася. Я яшчэ гэтага не ўмеў. Пайшлі шукаць дапамогу. Сустрэлі мужчыну з суседняй вёскі. Ён запрог каня, і мы паехалі да сваёй хаты. Калі пад'язджалі, убачылі, што па вёсцы ў белых халатах ланцужком ідуць немцы. Я сказаў маме, што трэба ўцякаць. Каня прывязалі на ўскрайку вёскі і сышлі глыбока ў лес. Доўга сядзелі, а пад вечар вярнуліся ў вёску і хутчэй пайшлі ў сваю хату».

Тое, што яны там убачылі, Аляксандр Маркавіч дагэтуль не можа забыць. На падлозе ляжаў мёртвы Фёдар. Фашысты закалолі яго штыком. Маці сама пахавала сына.

Вёску спалілі пазней. На шчасце, жыхары знаходзіліся ў лесе. Своечасова пакінулі падпольную рэдакцыю, якая некаторы час размяшчалася ў хаце Марфы Мігун, і супрацоўнікі газет «Звязда» і «Чырвоная змена» — выхад выданняў у Дварцы быў адноўлены ў студзені 1943 года.

Людзі вярнуліся з лесу на папялішча. Усе хаты, а іх у вёсцы налічвалася каля 30, былі спалены. «Засталася адна недабудаваная, якую ўзводзіў сабе мой старэйшы брат Піліп, — заўважае Аляксандр Маркавіч. — На ёй не было даху, стаяў толькі зруб, вось ён і ацалеў. Пасля вайны хату дабудавалі, там і жылі».

Не ўсе жыхары Дварца вярнуліся на папялішчы. Трагічны лёс напаткаў сям'ю Марыі Ахрамейкі. У той час, як навокал лютавалі карнікі, разам з дочкамі (дзве дарослыя і адна падлетак) жанчына жыла ў курані, які пабудавалі ў лесе. Калі пачалася аблава на партызан, небяспечна было заставацца нават там. Аднак гаспадыня прыняла рашэнне не ўцякаць: адна з яе дачок таксама захварэла на тыф.

— Бабуля не магла пакінуць хворую дачку, таму засталася, — расказвае яе ўнучка Кацярына Вялічка. — Разам з ёй у курані яшчэ былі дзве дачкі і ўнучка. Партызаны папярэджвалі іх, каб уцякалі: казалі, што карнікі могуць прыйсці і сюды. Бабуля сказала, што ніхто нікуды не пойдзе: маўляла, што будзе адной, тое будзе і ўсім.




У хаце Анатоля Вялічкі захоўваецца шмат памятных здымкаў родных, якія ведаюць пра трагічныя падзеі на Любаншчыне ў гады фашысцкай акупацыі.

Немцы не пашкадавалі нікога. Забілі яшчэ і ненароджанае дзіця — адна з дачок Марыі Ахрамейкі была цяжарная. «Калі ўсё сціхла, мая мама-партызанка пайшла паглядзець, што ў іх у курані робіцца, — працягвае Кацярына Вялічка. — І цётка яе, і сёстры, і пляменніца былі нежывыя. Адна Вольга, стрыечная сястра, падавала прыкметы жыцця. Яе паранілі ў жывот, але куля, відаць, разрыўная была — Вольга была яшчэ жывая. Абвязала яе рану белай прасцінай, якую знайшла ў хаце, паставіла побач шклянку з вадой, а сама кінулася на ўцёкі — карнікі прачэсвалі лес».

На другі дзень разам з сябрам сям'ю пахаваў бацька Кацярыны Вялічкі. Сярод загінулых былі яго жонка і дачка. У адну магілу паклалі яшчэ жанчыну з дзяўчынкай, якім таксама не пашчасціла выратавацца. Гэтую брацкую магілу, якая знаходзіцца ў лесе, даглядае сям'я Кацярыны Данілаўны. Гэта іх асабістая ініцыятыва, маральны абавязак перад тымі, хто не дажыў да Перамогі. У гонар загінулых жонкі, дачкі і цешчы бацька Кацярыны Вялічкі назваў сваіх дачок, якія нарадзіліся ў другім шлюбе.

### «ПАХ ГАРЭЛАГА ЧАЛАВЕЧАГА МЯСА ТРЫМАЎСЯ Ў ПАВЕТРЫ»

Напярэдадні апошняй буйной карнай аперацыі фашыстаў на Любаншчыне «Марабу», мэтай якой было знішчэнне партызанскіх злучэнняў, якія дзейнічалі ў тыле ворага, нацысты спалілі вёску Фёдараўка. Трагедыя адбылася тут у лютым 1944 года. Як і ў многіх выпадках, партызаны загадзя папярэдзілі мясцовых жыхароў аб тым, што трэба пакінуць вёску. Адны паверылі і сышлі ў лес. Другія разлічвалі, што іх не крануць: маўляў, сваяк служыць у паліцыі. Фашысты не пашкадавалі нават іх. У Фёдараўцы загінулі некалькі сем'яў — усяго 14 чалавек.

У гэты сумны спіс пашчасціла не трапіць Мікалаю Мазаніку. Яшчэ ў пачатку студзеня партызаны паведамілі, што ў бок вёскі ідзе карны атрад. Разам з многімі яго сям'я збегла ў лес.

*«Прыйшоўшы на месца, карнікі спалілі вёску, выбралі найлепшы тутэйшы дом, загналі ў яго ўсіх астатніх жыхароў і падпалілі, — успамінаў Мікалай Мазанік. — Немец стаў у дзвярах, з аўтамата страляў па людзях. Калі дом моцна загарэўся, немец зачыніў дзверы і пайшоў. Пажылому мужчыну па прозвішчы Коўган куля трапіла прама ў жывот. Мужчына быў у поўнай прытомнасці. Ён папрасіў: «Анета, ты можаш хадзіць. Вылазь праз акно — дом гарыць. І раскажы, як мы гінем». На наступны дзень я захацеў прайсці і паглядзець на тое, што нарабілі ў Фёдараўцы фашысты. Вёска яшчэ дымілася, дагаралі драўляныя падмуркі хат. Ляжалі спаленыя людзі, чарапы іхнія абгарэлыя былі белымі, як снег. Карціна была страшная. Такое я бачыў упершыню. Колькі тады мне было? Дванаццаць-трынаццаць гадоў. Пах пажару, пах гарэлага чалавечага мяса трымаўся ў паветры дватры дні. Ды і потым часам гэты пах адчуваўся. Пасля я пайшоў на хутар. На хутары быў адзін згарэлы чалавек. Хто ён такі — я не ведаю. Пасля сабраліся аднавяскоўцы, сваякі, сабралі абгарэлыя астанкі людзей і пахавалі ў агульнай магіле на могілках...»*

Некаторыя вёскі гарэлі ледзь не кожны год. І адраджаліся — як птушкі Фенікс. Не далічылася Любаншчына пасля вайны толькі аднаго населенага пункта. Аднак памяць аб Савалуцку жыве і будзе жыць: пакуль там, на могілках спаленай вёскі, цвіце груша-дзічка, пакуль нашчадкі народа-пераможцы ідуць да памятнага знака, пратоптваючы сяродляснога зарасніку сцяжынку.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении **15 марта** 2023 **года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| «Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 119 363,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **15 марта 2023 года в 12.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.02.2023 по 13.03.2023** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении **15 марта** 2023 **года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| «Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| Начальная цена: 583 040,40 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 58 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **15 марта 2023 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.02.2023 по 13.03.2023** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## Уважаемые акционеры ОАО «Электроремонтный завод»

**31 марта 2023 года в 13.00**

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Электроремонтный завод»**

Собрание пройдет по адресу:
г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 19, третий этаж, зал заседаний.

**Повестка дня собрания**

**1.** О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год и основных направлениях деятельности Общества на 2023 год.
*Докладчик – директор Общества.*

**2.** Отчет о работе наблюдательного совета в 2022 году.
*Докладчик – председатель наблюдательного совета Общества.*

**3.** О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2022 год.
*Докладчик – директор Общества.*

**4.** Утверждение бухгалтерского баланса Общества, отчета о прибылях и убытках.
*Докладчик – директор Общества.*

**5.** О распределении прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2022 год.
*Докладчик – директор Общества.*

**6.** Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества (после уплаты налогов, сборов, пошлин, других обязательных платежей) на 2022 год и 1-й квартал 2023 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2023 год.
*Докладчик – директор Общества.*

**7.** Утверждение Устава Общества.
Докладчик – директор Общества.

**8.** Избрание членов наблюдательного совета.
**9.** Избрание членов ревизионной комиссии.
**10.** О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за осуществление возлагаемых на них обязанностей.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19 (приемная директора 3-й этаж) с 21.03.2023 г. по 30.03.2023 г. (время работы с 12.00 до 15.00) в рабочие дни понедельник–четверг и в день проведения собрания 31.03.2023 г. с 11.00 до 12.30.

Регистрация участников собрания **31 марта 2023 года с 11.00 до 12.30** по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 марта 2023 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
**- акционеру общества – паспорт;**
**- представителю акционера и юридическим лицам – паспорт и доверенность!**

УНН 100008169

17 марта 2023 г. в 15.00 состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2022 год и основных направлениях деятельности общества в 2023 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2022 г.
4. Утверждение распределения прибыли общества за 2022 г., о выплате дивидендов за 2022 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2023 году и первом квартале 2024 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Время регистрации в день проведения собрания с 14.30 до 15.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 24 февраля 2023 года (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Дата сбора реестра – 15.02.2023 г.

Совет директоров.

УНН 200246280

# ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона)
## извещает о проведении 27 марта 2023 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Острошицы, ул. Парижской Коммуны, 21А,** кадастровый номер 623286306601000630, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,0800 | Черта населенного пункта. Имеются сети: водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение | 15 000,00 | 1 500,00 | 2174,00 + расходы за размещение объявления |
| 2 | **аг. Острошицы, ул. Дружная, 12** с незавершенным законсервированным капитальным строением, кадастровый номер 623286306601000435, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,2495 | Черта населенного пункта. Имеются сети: водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение | 45 000,00 | 4 500,00 | 337,58 + расходы за размещение объявления |
| 3 | **д. Чуденичи, ул. Звездная, 3** с незавершенным законсервированным капитальным строением, кадастровый номер 623286308101000238, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | 0,1689 | Черта населенного пункта. Имеются сети: водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение | 25 000,00 | 2 500,00 | 353,61 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 27 марта 2023 года в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, 7, Острошицкий сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 28-1-45, 28-1-31; (+37529) 6613988.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по 21 марта 2023 года включительно до 17.00.

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предъявить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток (10 % от начальной цены)** перечисляется на расчетный счет № BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, БИК AKBBBY2X УНН 600537220 код платежа 04901, получатель Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» и Положением «О порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 (ориентировочная стоимость: питьевое водоснабжение аг. Острошицы – 2355,21 руб./1 куб.м /сут., д. Чуденичи – 1558,58 руб./1 куб. м /сут.; электроснабжение аг. Острошицы – 649,95 руб./1 кВт, д. Чуденичи – 1628,45 руб./1 кВт; объекты транспортной инфраструктуры аг. Острошицы – 25852,32 руб./за 1 га, д. Чуденичи – 19127,60 руб./за 1 га).

# ХТО ЁН, СУЧАСНЫ РАБОЧЫ?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Летась упершыню ў каледжы набралі дзве групы на базе дзевяці класаў па прафесіях «кухар, афіцыянт» і «кандытар, кухар» — па 30 чалавек кожная. Дык вось, на 60 месцаў было каля 150 ахвотных. «Такога попыту, шчыра кажучы, мы не чакалі, — прызнаецца дырэктар. — Мяркую, што калі б груп было больш, то мы запоўнілі б усе месцы...»

Ён упэўнены, што найлепшымі папулярызатарамі навучальнай установы з'яўляюцца самі навучэнцы каледжа, калі, вядома, ім цікава там навучацца: «Майстар-класы для іх праводзілі практычна ўсе брэнд-шэфы рэстаранаў у Гомелі. Гэта нашы выпускнікі. Адна справа, калі пра будучую прафесію расказваюць дырэктар ці выкладчыкі, і зусім іншая — паслухаць пасяховых выпускнікоў, якія ўжо сталі прафесіяналамі ў сваёй справе і могуць падзяліцца нюансамі прафесіі, пра якія ведаюць толькі яны. Адзін з брэнд-шэфаў у гутарцы са мной неяк прызнаўся, што раней ён не хацеў дзяліцца інфармацыяй, але цяпер разумее: чым больш ведаў аддасць, тым больш прафесіяналаў атрымае на выхадзе.

У каледжы ёсць уласная сталовая, дзе навучэнцы праходзяць практыку. Напрыклад, будучыя афіцыянты вучацца працаваць з кліентамі, абслугоўваючы іншых навучэнцаў каледжа. «Работа з жывымі людзьмі — вельмі складаная і шматгранная, — падкрэслівае Уладзіслаў Шапялевіч. — Хто такі афіцыянт? Гэта «твар» і «душа» любога бара, кавярні ці рэстарана. Ён працуе з наведвальнікамі, кансультуе іх, прымае заказы, прыносіць гатовыя стравы і напіткі. Ад яго залежыць настрой кліента, а значыць, і пасяховасць бізнесу. Нашы навучэнцы прайграюць розныя сітуацыі, каб быць да іх гатовымі ў будучыні...»

Каледж з 2014 года актыўна ўдзельнічае не толькі ў абласных і рэспубліканскіх, але і ў міжнародных конкурсах прафесійнага майстэрства. Яго прадстаўнікамі заваявана вялікая колькасць узнагарод і дыпломаў. «Зразумела, што ўсе не могуць стаць прызёрамі, але ўсе павінны мець магчымасць акунуцца ў атмасферу падрыхтоўкі, атрымаць эмацыянальны зарад і адчуць дух спартыўнага сапеніцтва. Гэта датычыцца не толькі конкурсу, але і вучобы», — падкрэсліў Уладзіслаў Шапялевіч.

Ён таксама расказаў аб сваім вопыце зносін з навучэнцамі. Два разы на год у каледжы праходзіць «Сустрэча з дырэктарам», на якую прыходзяць усе ахвотныя. «Вельмі нефармальнае і няпростае для мяне мерапрыемства, таму што падрыхтавацца да яго немагчыма, — прызнаўся дырэктар. — Самая кароткая сустрэча доўжылася 2,5 гадзіны, самая працяглая — 5 гадзін. Абмяркоўваюцца самыя розныя тэмы і пытанні: ад прафесійных тэм, навучання, правядзення майстар-класаў, арганізацыі быту ў інтэрнаце да сацыяльных прапаноў і нават музыкі. Пытанні часта нязручныя, на іх не заўсёды можна адказаць адразу. Але гэты фармат асабіста мне дае магчымасць трымаць руку на пульсе: я ведаю, што сёння актуальна для навучэнцаў і што іх хвалюе. Асаблівa цікава сустракацца з навучэнцамі выпускнога курса, якім ёсць што сказаць і пры гэтым выказваць думкі ўжо нястрашна...»

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ З ЗАКАЗЧЫКАМІ КАДРАЎ

У маі бягучага года ў краіне пройдзе фінал пятага рэспубліканскага чэмпіянату прафесійнага майстэрства па 49 кампетэнцыях.

«Яго пераможцы будуць мець ільготы пры паступленні на ўзровень сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў 2023 годзе», — паведаміла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі — начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Удзел у іх прыцягвае і патэнцыяльных абітурыентаў, і арганізацыі, паколькі яны бачаць узровень выканання работ па тых ці іншых кампетэнцыях.

адбываюцца ў вытворчым сектары эканомікі. Таму і абнаўленне навучальных планаў адбываецца штогод, уводзяцца новыя тэмы, раздзелы, новы змест практыкі».

Рэктар РІПА звярнуў увагу на важнасць узаемадзеяння з рэальным сектарам эканомікі. Партнёры ўсё больш разумеюць, што трэба сумесна займацца зместам адукацыі, які ляжыць у аснове кампетэнцый будучага спецыяліста. «Інфармацыйныя кабельныя сеткі», «Абслугоўванне сістэм водападрыхтоўкі і водаачысткі», «Архітэктурны дызайн гарадскога асяроддзя» — абнаўленне спецыяльнасцяў ідзе ва ўнісон з развіццём тэхналогій на рынку працы. У прыватнасці, абнаўленне зместу такой спецыяльнасці, як «Арганізацыя тэхнічнага сэрвісу транспартных сродкаў» ідзе з акцэнтам на электрамабілі. «Вы ведаеце гэты трэнд у вытворчасці,



— Мы неаднойчы адзначалі, што конкурсы праводзяцца не толькі дзеля таго, каб вызначыць пераможцаў. Гэта таксама магчымасць для школьнікаў і іх бацькоў убачыць, у чым заключаецца сутнасць той ці іншай прафесіі, — падкрэслівае **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі (РІПА) Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Прычым разуменне прафесіі фарміруецца не па апісанні, а яе спецыфіку можна ўбачыць на сваe вочы. Конкурсы прафесійнага майстэрства мы разглядаем таксама і як пляцоўку ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў. Яшчэ на этапе падрыхтоўкі да чэмпіянату прадпрыемствы ўдзельнічаюць у складанні конкурсных заданняў і ў аснашчэнні пляцовак пад тэхналогіі, якімі павінен валодаць конкурсант. Магчыма, работадаўцы прыглядаюцца да сваіх патэнцыяльных работнікаў, калі бачаць, наколькі складаныя задачы конкурсант можа выконваць.

## НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І КАМПЕТЭНЦЫІ

«Выбар прафесійнай адукацыі — гэта эфектыўны старт у будучыню. Хацелася б, каб тое ўсведамляла грамадства і бацькі, якія ўплываюць на выбар прафесіі дзяцей, — падкрэслівае Валерый Галубоўскі. — Патрэбы рынку працы ў кваліфікаваных кадрах растуць, і гэта сусветны трэнд. Сёння рабочыя кадры ўжо не тыя, што былі раней, паколькі праца ўскладняецца і патрабуе ўмення карыстацца новымі тэхналогіямі, праектнага мыслення. Многія прафесійныя задачы рабочага звязаны з тым, каб спачатку стварыць нейкую мадэль або спраектаваць памяшканне, каб выканаць у ім тыя ці іншыя работы. Гэта прадугледжвае новы ўзровень зместу адукацыі і асваенне новых кампетэнцый. Сістэма прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі найбольш дынамічная, таму што мы знаходзімся пад ціскам змен, што

ён нарастае і ў сэрвісным абслугоўванні, — адзначыў Валерый Галубоўскі. — Сучасныя тэндэнцыі сведчаць, што праца будзе станавіцца ўсё больш высокатэхналагічнай. Адукацыйнае асяроддзе ў нашых навучальных установах дазваляе навучэнцам асвоіць кампетэнцыі, запатрабаваныя не толькі сёння, але і найбольш перспектыўныя, аб якіх перадавыя прадпрыемствы толькі задумваюцца. Яны, дарэчы, хутка падхопліваюць такіх выпускнікоў. У цэнтрах кампетэнцый, якіх па краіне створана 52, канцэнтруюцца самыя сучасныя абсталяванне і тэхналогіі».

## СТАРЫЯ НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Цяпер што датычыцца будучай прыёмнай кампаніі. Выпускнікам і іх бацькам трэба ведаць, што ўсе ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў бягучым навучальным годзе сталі каледжамі. Каледжы могуць рэалізоўваць праграмы і прафесійна-тэхнічнай, і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Многія з іх прапануюць праграмы адразу на двух узроўнях: рыхтуюць па рабочых прафесіях і спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Але, напрыклад, медыцынскія, педагагічныя каледжы і каледжы сферы культуры прапануюць навучанне толькі на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

На ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2023 годзе плануецца прыняць каля 39 тысяч абітурыентаў, з іх 27 тысяч — за кошт сродкаў бюджэту. Тэрміны прыёмнай кампаніі застануцца прыкладна на ўзроўні мінулых гадоў — з 20 ліпеня да 18 жніўня (яны пакуль не зацверджаны).

На ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі залічаць каля 26 тысяч чалавек. Прыём дакументаў — з 15 да 23 жніўня. Калі застануцца незапоўненыя месцы, прыём можа быць прадоўжаны.

Як адзначыла Аляксандра Пятрова, сёлета будзе павялічаны набор на базе дзевяці класаў як на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай, так і на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі:

— Трэба разумець, што выпускнік 9 класа стаіць перад дылемай. Што рабіць: працягваць навучанне на старшай ступені школы або ісці навучацца на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі? Як вы ведаеце, паводле Кодэкса аб адукацыі, агульная сярэдняя адукацыя цяпер з'яўляецца ў нас абавязковай. Таму, выбіраючы навучанне ў каледжы на любым узроўні, малады чалавек праз тры-чатыры гады атрымае і дыплом, які дазволіць яму паступаць на больш высокі ўзровень адукацыі, і адну, дзве або тры прафесіі, у залежнасці ад той сферы, якую ён абраў, а значыць, і фінансавую самастойнасць, — тлумачыць Аляксандра Пятрова. — На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі, як правіла, гэта дзве-тры рабочыя прафесіі. Напрыклад, «машыніст экскаватара; кіроўца пагрузчыка», «слесар па рамонце сельгасмашын; трактарыст-машыніст сельгасвытворчасці» або «кухар—садавод—агароднік». Гэта павышае канкурэнтаздольнасць выпускніка, страхуе яго ад сезоннасці работ, як у выпадку з агароднікам або трактарыстам. Гэта значыць, выпускнік будзе запатрабаваны арганізацыямі цэлы год. Спалучэнне прафесій ва ўстановах адукацыі залежыць ад патрэбы ў кадрах у канкрэтным рэгіёне.

«Цяпер у нас актыўна развіваецца адукацыйная праграма «Рабочы з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй». Нядаўна адбылася знакавая падзея: уступіў у сілу абноўлены Агульнадзяржаўны класіфікатар АКРБ 011-2022 «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», — праінфармавала Аляксандра Пятрова. — У 2023 годзе прыём будзе ажыццяўляцца ўжо па абноўленым класіфікатары. Але абітурыенты і іх бацькі не павінны хвалявацца, калі яны, напрыклад, не ўбачаць спецыяльнасць, якая была раней. Напрыклад, у старым класіфікатары была спецыяльнасць «Аўтамабілебудаванне», а ў абноўленай версіі яна называецца «Вытворчасць транспартных сродкаў». Спецыяльнасць засталася, але ў яе памянялася назва. Гэта звязана з тым, што новы класіфікатар прыведзены ў адпаведнасць з класіфікатарам відаў эканамічнай дзейнасці, актуальным сёння.

Вельмі папулярная сярод абітурыентаў спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» цяпер будзе называцца «Распрацоўка і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм». Разам з тым кваліфікацыя «тэхнік-праграміст» захавалася».

Аляксандра Пятрова запэўніла, што на сайтах устаноў адукацыі інфармацыя аб старых і новых найменнях спецыяльнасцяў будзе састыкавана. Гэта значыць, там будзе прысутнічаць найменне спецыяльнасці ў новай рэдакцыі і найменне, якое было раней, каб абітурыенты разумелі, на якую спецыяльнасць яны паступаюць.

## ПАСТУПЛЕННЕ БЕЗ ЗДАЧЫ ЦТ

Упершыню ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі будуць прымаць па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі як на аснове 9 класаў, так і на аснове 11 класаў і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Раней абітурыенты, якія паступалі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, здавалі два прадметы на ЦТ. Цяпер жа іх будуць ранжыраваць у залежнасці ад бала атэстата і адзнак у атэстаце па профільных прадметах (пры аднолькавым сярэднім бале ў атэстаце), Захаваюцца толькі ўнутраныя іспыты на творчых спецыяльнасцях і спецыяльнасці «фізічнае выхаванне».

Дарэчы, на некаторых спецыяльнасцях у каледжах фарміруюцца вельмі сур'ёзныя конкурсы. Так, у філіяле БДУІР — Мінскім радыётэхнічным каледжы — прахадны бал на базе 9 класаў на спецыяльнасць «інфармацыйныя тэхналогіі» летась быў 9,9.

На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі попытам у абітурыентаў традыцыйна карыстаюцца такія прафесіі, як «цырульнік», «памочнік машыніста цеплавоза, электравоза, электрацягніка», «электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання», «слесар па рамонце аўтамабіляў». У розных рэгіёнах конкурсы па гэтых спецыяльнасцях былі ад 1,2 да 2 чалавек на месца.

Аляксандра Пятрова і Валерый Галубоўскі падкрэсліваюць, што попыт на выпускнікоў каледжаў на рынку працы значна перавышае прапанову. Гэта значыць, што з працаўладкаваннем праблем не ўзнікне дакладна. І зусім не варта разглядаць атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі як фінішную лінію ў сваім прафесійным развіцці. Гэта толькі першая прыступка. Пасля заканчэння навучання можна выбраць скарочаную форму атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі або паступаць у ВНУ на агульных падставах.

**«Сёлета прыём будзе ажыццяўляцца па абноўленым Агульнадзяржаўным класіфікатары «Спецыяльнасці і кваліфікацыі». Але абітурыенты і іх бацькі не павінны хвалявацца...»**

«Прафесійна-тэхнічная адукацыя, акрамя прафесіі, дае яшчэ і розныя ўніверсальныя кампетэнцыі, напрыклад, веды і ўменні ў галіне матэрыялазнаўства, электратэхнікі, што дазваляе выпускнікам у далейшым на шляху самаразвіцця даволі хутка пераключацца і атрымліваць сумежныя прафесіі, — падкрэслівае Аляксандра Пятрова. — Практыкаарыентаванасць навучання ў каледжах даходзіць да 70 працэнтаў».

«Спецыялісты, якія спачатку навучаліся ў прафесійна-тэхнічнай установе, затым — у сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай, сёння самыя запатрабаваныя і паспяховыя, — запэўнівае Валерый Галубоўскі. — Менавіта ім работадаўцы аддаюць перавагу пры правядзенні конкурсу на пасаду, ім давяраюць найбольш складаную, адказную працу, з імі раяцца. І ўсё таму, што яны добра ведаюць увесь працэс вытворчасці не толькі тэарэтычна, але і практычна. Нават пры навучанні ў ВНУ сучасны студэнт тэхнічнага профілю імкнецца атрымаць паралельна яшчэ і рабочую спецыяльнасць, бо, каб стаць добрым інжынерам, трэба валодаць навыкамі эксплуатацыі абсталявання, разумець спецыфіку і структуру прамысловых працэсаў. Мяжа паміж рабочым і інжынерам усё больш размываецца».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ігуменскі тракт

**КОНІК скача па наезджанай дарозе, а мы ў паштовай карэце хутаемся ў цёплыя кажухі, слухаем вясёлы галасок званочка і, пакуль рамізнік вязе нас з губернскага Мінска ў павятовы Ігумен, разглядаем заснежаныя краявіды. Менавіта такім мы ўяўляем падарожжа па Ігуменскім тракце... Канешне, цалкам адчуць усе тыя эмоцыі, якія былі ў падарожніка пару стагоддзяў таму, калі сядзіш у камфартабельным аўтобусе, наўрад ці атрымаецца, але і сучасная вандроўка дазваляе зазірнуць у гісторыю, адкрыць паштовыя сакрэты і больш даведацца пра былы павет.**
**Ідэя аб падарожжы па Ігуменскім тракце з'явілася яшчэ дзесяць гадоў таму. Такі маршрут супрацоўнікі Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея распрацавалі да 625-годдзя горада. Праўда, доўгі час падарожжа пераважна было ўяўным — разам з юнымі наведвальнікамі музейшчыкі званілі ў званочкі паштовай карэты, «дастаўлялі» пошту і адкрывалі сакрэты павятовага горада. Сёння ў Ігумен можна выправіцца са старшым навуковым супрацоўнікам Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея Ірынай Вабішчэвіч, якая з'яўляецца атэставаным экскурсаводам на гэтым маршруце.**



Палацава-паркавы комплекс Ваньковічаў-Манюшкаў.

# ПАДАРОЖЖА ПА ІГУМЕНСКІМ ТРАКЦЕ

## Частка I. У ГОСЦІ ДА СТАНЦЫЙНАГА НАГЛЯДЧЫКА

### СТАРЫЯ ШЛЯХІ

Паводле пісьмовых крыніц, яшчэ з канца XIII стагоддзя ў Мінску працавала княжацкая паштовая служба. У XIV стагоддзі яна ўжо мела пэўную структуру, недзе з гэтага часу і пачынаецца рух па паштовым тракце. Яшчэ пры польскім каралі Станіславе Аўгусце было прыдумана паштовае кляймо, якое ставілася на карэспандэнцыю ў пунктах адпраўлення і прызначэння. Такія штампы робяцца і сёння.



У адным з пакояў музея Станіслава Манюшкі.

У 1795 годзе Мінск становіцца цэнтрам паштовай службы на заходніх землях Расійскай імперыі. Ад яго ў розны бок беглі дарогі. На поўнач сыходзіў Віленскі тракт, ён ішоў праз Радашковічы і Ашмяны. Заходні тракт, які пралягаў праз Новы Свержань і Нясвіж, злучаў з Варшавай і далей з Венай. На ўсход праставаў Магілёўскі тракт, які пасля накіроўваў на Смаленск і на Маскву. Адзін са шляхоў вёў на Ігумен, а пасля праз Бабруйск на поўдзень.

Пісьмовыя крыніцы нават дапамагаюць удакладніць, у якім месцы ў Мінску стаяў паштовы двор, — непадалёк ад Кузьма-Дзям'янаўскага манастыра, які да нашага часу не захаваўся.

Дарэчы, сучасная мінская вуліца, якая носіць назву Ігуменскі тракт, да былой паштовай дарогі не мае дачынення. Хоць знаходзіцца недалёка — старадаўні шлях пралягаў там, дзе сёння знаходзяцца вуліцы Свярдлова, Маякоўскага і Чыжэўскіх.

Трактам у Расійскай імперыі называлі вялікія дарогі, пра якія яшчэ ў народзе казалі «бальшакі». Паміж губернскім Мінскам ды Ігуменам было ўсяго 60 вёрст, і, тым не менш, на гэтым шляху размяшчалася тры паштовыя станцыі: у Каралішчавічах, Смілавічах і Нятрэбах. І гэта пры тым, што ў той час нормай лічылася, што прыпынкі павінны стаяць на адлегласці ў 40 вёрст. Менавіта столькі коні маглі пераадольваць без адпачынку.

Рамізнік павінен быў рухацца з хуткасцю каля дзевяці вёрст у гадзіну. Затрымаецца ў дарозе — будзе аштрафаваны, прыедзе раней — таксама, бо гэта сведчыць, што ён не беражэ коней. Прасачыць яго шлях мог станцыйны наглядчык, які правяраў адзнакі з папярэдніх прыпынкаў.

І не трэба забывацца, якімі ў той час былі дарогі. У дажджлівае надвор'е паштовыя карэты маглі на іх захраснуць. У непагадзь ці ўначы, каб не збіцца са шляху, фурманы маглі адпускаць лейцы з надзеяй, што коні самі пойдуць па знаёмым ім шляху. Прытрымлівацца маршруту дапамагалі верставыя чорна-белыя слупы. У цёмны час яны былі добра бачныя пры святле ліхтара, якім забяспечвалася карэта.

### ПАШТОВЫЯ САКРЭТЫ

На кожным прыпынку можна было альбо перапрэгчы коней, альбо даць ім адпачыць. Вазніцы дастаўлялі не толькі пошту, але і грузы і падарожнікаў. На аднаго каня магло выпадаць дзесяць пудоў грузу і адзін пасажыр.

Пэўныя перавагі пры абслугоўванні на станцыі былі ў кур'ераў, дзяржслужачых і людзей, якія мелі спецыяльную паперу, так званую падарожную. Дарэчы, копія такога дакумента захоўваецца ў Чэрвеньскім краязнаўчым музеі.

Пасля выканання задання рамізнікі маглі адпачыць у вольны дзень, а вось у станцыйнага наглядчыка такой магчымасці не мелася. Ён пастаянна павінен быў знаходзіцца на станцыі, прыслухоўвацца, ці не звініць званочак паштовай карэты, і ў любы час сутак прымаць падарожнікаў. У цёмны час запальваць ліхтар. Дапамагаць гасцям размясціцца на адпачынак, вырашаць іх пытанні і прымаць пошту.

На кожнай станцыі былі стол, табурэткі і хаця б адна канапа. Вядома, што Мінскі губернскі паштовы дом меў 45 коней, 15 паштовых карэт, 16 армякоў, столькі ж пар кажухоў. Цёплымі рэчамі забяспечваліся фурманы, пры неабходнасці іх маглі выдаць і важным пасажырам.



Генеалагічнае дрэва ў музеі «Прастора Хаіма Суціна».

У халоднае надвор'е станцыйныя наглядчыкі сачылі і за тым, каб не астывала вада ў самаварах, каб госці хутчэй маглі сагрэцца з дарогі чаем.

Падарожжа па Ігуменскім тракце дае магчымасць адкрываць цікавыя мясціны і гісторыю, у якую ўплецены лёсы знакамітых людзей, паданні, расповеды пра тое, чым займаліся, у што верылі і пра што марылі жыхары.

Вандроўка пралягае праз Смілавічы, дзе можна выпіць кавы ў французскай кавярні «Ратонда» — пад яе стылізавана адна з залаў музея «Прастора Хаіма Суціна». Тут жа даведацца пра творчасць знакамітых мастакоў Парыжскай школы — ураджэнцаў Смілавіч.



Фрагмент экспазіцыі Чэрвеньскага раённага краязнаўчага музея.

У музычнай гасцёўні Станіслава Манюшкі, якая створана ў гарадскім пасёлку, абавязкова трэба паслухаць музыку выдатнага кампазітара, заснавальніка польскай і беларускай оперы. У гэтым жа будынку працуе адзіны ў свеце музей, прысвечаны гэтай славутай асобе.

Можна паглядзець на палацава-паркавы комплекс Ваньковічаў-Манюшкаў, у якім працягваюцца рэстаўрацыйныя работы, і знайсці чорныя смілавіцкія сосны, якія пасадзіў дзядзька кампазітара — Казімір Манюшка, вядомы батанік. Альпійскія сосны, пасаджаныя ім 200 гадоў таму, — батанічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння. На жаль, адна з соснаў, калі гэтай зімой у межах семінара Нацыянальнага агенцтва па турызме мы наведалі парк у Смілавічах, стаяла сухая. Кажуць, што неаднойчы адсюль ужо бралі шышкі, якіх багата падае, але вырасціць з іх дрэўца ні ў кога не атрымалася. Запасліся шышкамі і мы — праверым, раптам у нас сасновае насенне ўзыдзе.

Наогул, у Смілавічах можна правесці цэлы дзень — і не факт, што вы паспееце азнаёміцца з усімі мясцовымі цікавосткамі. Для падарожнікаў тут ёсць нават падказка — графіці на адным з будынкаў, дзе пазначаны 22 мясціны, якія варта наведаць у гарадскім пасёлку. Але наша «паштовая карэта» ўжо спяшаецца ў Ігумен...

**Ганна ПЯТРОВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Аб самім слаўным горадзе Ігумен (ён жа — Чэрвень) — у наступным выпуску «Ігуменскага тракта».*

Перабіраючы архівы...

# «КАБ СЭРЦА СЭРЦУ САМО ГОЛАС ДАВАЛА ...»

## Што пісалі беларускія літаратары сваім каханым?

Колькі пяшчоты і пакуты пакінулі беларускія літаратары ў лістах да каханых!

*«Не сустрэліся ні разу*
*мы з табою за вайну,*
*А твае лісты з маімі*
*стрэчу мелі не адну».*
*Кожны раз на паўдарозе*
*сустракаюцца яны:*
*На вайну твой ліст імкнецца,*
*мой спяшаецца з вайны»*, — сумуючы па каханай жонцы Аксане Вечар, пісаў Аркадзь Куляшоў у 1944-м, параўноўваючы іх лісты з галубамі: *«Так ім любы пуцявіны, што да нас з табой вядуць, быццам зерні за навіны з нашых рук яны клююць».*

Мастацкія творы робяцца вядомымі публіцы... А вось рэальная любоўная перапіска часта схаваная ад чужых вачэй. Ды й колькі яе панішчана аўтарамі ў сталым веку, калі асэнсоўваюцца памылкі маладосці! Але зборнікі любоўных лістоў былі страшэнна папулярныя яшчэ некалькі стагоддзяў таму. Памятаеце, як герой рамана Стэндаля Жульен Сарэль, перапісваючы чужыя лісты, заваяваў сэрца недаступнай прыгажуні?

Давайце сёння, на падыходзе да вясны, перачытаем лісты беларускіх пісьменнікаў да сваіх каханых.

### «І цалаваў бы цябе, і на руках насіў бы...»



Беларускі паэт Карусь Каганец, сваяк Гіёма Апалінэра, той самы, які, падобна Дыягену, удзень хадзіў з запаленым ліхтаром і казаў, што шукае беларуса, напісаў вершаваны цыкл «Спяванні мілосныя «Каханне Каганца». Прысвечаны ён быў паненцы Ганне Пракаповіч.

*«То не кветка у траве*
*І не птушка сэрца рве,*
*А дзяўчына між нас е*
*Мільша жыцця для мяне...»*

Але, акрамя вершаў, захаваліся і лісты Каганца да яго абранніцы, адпраўленыя ў вёску Добасня пад Бабруйскам, дзе дзяўчына гасцявала ў радні. Вось адзін з тых лістоў:

*«Люба Ганусю!*

*Ты, галубка, пэўна, на мяне гневаешся? Але бо я, па-праўдзе, сказаўшы, трохі і вінават, што не здагадаўся раней к табе напісаці... У чацвер быў у Койданаве, выслухаў імшу і думаў знайду ад цябе які лісток, але мусіў без нічога дадому вяртаціся; у нядзелю, т.е. сёння, зноў пасылаў, але і зноў няма нічога, хоч быў пэвен, што будзе ад цябе яка вестачка, бо як толькі ўстаў, так на душы зрабілася якась добра, радасна, здаецца, каб прымеў і цалаваў бы цябе, і на руках насіў бы...*

*Пішы, Ганулька, будзь ласкава, бо мне дужа цяжка, і тым болей што не папрашчаўся з табою...*

*Бывай, галубка, здарова і пішы да мяне!*
*Твой Карусь*
*1899 г. 7 беразня месяца ў Прымагіллі».*

### «Як б'юцца два сэрцанькі ў адно»

Крытык Адам Бабарэка нават у высылцы знаходзіў сямейнае шчасце — да яго прыехала любая Аня з дзеткамі. Чыталі Гётэ, спявалі разам песні, глядзелі ўсёй сям'ёй на зоры... Лісты бязлітаснага крытыка Адама Бабарэкі да жонкі поўняцца пяшчотай. Вось ліст, напісаны 22 ліпеня 1931 года, калі паэта толькі выслалі з Вяткі ў пасёлак Слабадскі:

*«Любая Анечка, я прызнацца нат падумаў і так, мо і з Вяткі пісалася так таму, што хацелася бачыць сваю любую Анечку, глядзець на яе, любавацца на яе і бясконца цалаваць і цалаваць і цалаваць. Мо таму так і пісалася, што так моцна гарэла жаданне прытуліцца блізенька, блізенька да свае любае Анечкі*



*і так слухаць, як б'юцца два сэрцанькі ў адно і быць ціхім і цішынёю тэй гаварыць так многа, так, любая, каб уся істота казала, каб сэрца сэрцу само голас давала, як моцна, як шчыра б'юцца яны адным жыццём, аднымі думкамі, аднымі пачуццямі, аднэй вераю ў жыццё і будучыню. І ці можа быць большае што на свеце, як з'ява вось гэтага вялікага, непарушнага кахання, гэтай вялікай любові чалавека к чалавеку. І гэта цяпер на волі так шуганула полымем ува мне, што і я падумаў пра «кавёр-самалёт».*

### «Что ты для меня? Надо выяснить. Солнце? Сумрак? Радость? Печаль?»

Аляксандр Каратай, ён жа — паэт Максім Лужанін, і паэтка Яўгенія Пфляўмбаўм разам хадзілі ў літаратурнае аб'яднанне «Маладняк»... Каханне між імі ўтварылася палкае, цяжкае, на ўсё жыццё. Лужанін — сялянскі сын, які зрабіў сябе сам. Дужы, прыгожы, разумны. Ён галіў галаву «под Маякоўскага», насіў такі ж картуз — і сапраўды страшэнна да Маякоўскага быў падобны. Яўгенія, дачка мінскага чыгунačніка, скончыла гімназію, ведала некалькі моў, добра арыентавалася ў сусветнай літаратуры... Лужанін імкнуўся адпавядаць. Ці не таму перапіска між закаханымі нагадвае мастацкі твор? Давайце пачытаем ліст, адпраўлены дваццацігадовым Аляксандрам Каратаем Яўгеніі 13 студзеня 1930 года...





*«Никогда еще не были у меня такими непослушными карандаш и бумага.*

*Три раза я уже порвал все написанное. Не потому, что мудрствую, не хочу говорить искренне, просто потому, что как-то как надо не говорится вся славнота, которую хочется раскрыть тебе.*

*И вместо того, чтобы просто сказать, что я уже целых 26 часов не видел тебя, я пишу о том, что здесь чудный мостик, что сегодня я проехал 18 верст на конях, в санях — оврагами, пролесками, через речки, озера, и когда замерз, постучал в двери, и чуть не обомлел — ты!*

*Тишина... Такая тишина... Это взамен бури, в которую я хочу...*

*Но как жалко, что не видела ты сегодняшнего утра! Не ощущала холодного ветра в лицо! И не спеша бредут лошади, а я сижу тихонечко... Думаю все, думаю... вижу (...) твое лицо... библиотечную твою руку.*

*И недосказанного много, много... И каждый день увеличивается оно.*

*А может, а если бы.*

*И что это все такое? Что ты для меня? Надо выяснить. Солнце? Сумрак? Радость? Печаль?*

*Я тебе еще напишу. Сегодня. Завтра. Каждый день.*

*Не удивляйся только. Все будет ясным. А так, как теперь, еще никогда у меня не было».*

### «Твой Іваньчык»

Іван Мележ пазнаёміўся з Лідзіяй Пятровай падчас вайны, у Бугуруслане, куды трапіў пасля ранення. Дачка гаспадыні хаты, дзе спыніўся паранены франтавік, стала яго ным лёсам, вернай сяброўкай... Давайце пачытаем ліст, які 14 верасня 1947 года Мележ адправіў у Гагры, дзе адпачывала яго ная маладая жонка Лідзія з маленькай дачкой Людмілай.



*«Я думаю о тебе, особенно по утрам и вечерам. Твой образ является ко мне со светом и укачивает меня полусонного, когда я начинаю засыпать...»*

*Гэтыя словы — з пісем Флабэра, якія я чытаў сягоння. А мне здаецца, што яны напісаны не Флабэрам і не к Луізе Колэ, а к маленькай чарнамазай жанчынцы з вуліцы Клары Цэткін, к той, чый воблік усюды ідзе са мною — дзе б я ні быў, што б ні рабіў, ні думаў. Праўда, калі гаварыць пра мяне, то я цябе ўсё-ткі ўспамінаю вечарам і ночу больш за ўсё — тады, як астаюся адзін на адзін з сабою. Удзень лягчэй — амаль увесь час заняты чым-небудзь: то загараю, то абедаю, то снедаю, то сплю. Тым не менш і днём часта ўспамінаю і з сумам, што цябе няма побач. Асабліва калі што бачу харошае. Калі б ты была са мною, я б нічога не хацеў бы большага, я б не скучаў бы, не хандрыў бы...*

*Учора палучыў ад цябе пісьмо. Дазволь прыжаць цябе крэпка-крэпка і тысячу разоў за твае мілыя словы. Для мяне гэты лісток быў вялікай радасцю... Цэлае пасланне з ілюстрацыямі — і на сэрцы адлягло. Толькі ў другі раз пішы не вечарам, каб цемната не застаўляла цябе раней часу ставіць кропку. Добра? Цалую цябе ў шчочкі, носік, губкі, шыйку, і Людмілу — таксама. Крэпка, крэпка (хоць завочна) абдымаю.*

*Твой Іваньчык».*

### «Скучаю о тебе, Софунька, чертовски»



Першае каханне Міхася Лынькова, яго ная прыгажуня жонка Хана, загінула падчас Вялікай Айчыннай вайны разам з іх маленькім сынам Марыкам, закатаваныя фашыстамі. Лынькоў да канца жыцця не мог адысці ад гэтай трагедыі... Але пасля вайны ўсё-ткі сустрэў жанчыну, якая падтрымала, пакахала, — маладзенькая настаўніца Соф'я Куспіц пазнаёмілася з класікам, калі той прыехаў у школу выступаць. Праз тры дні Лынькоў паклікаў дзяўчыну замуж... Сваіх дзяцей у іх не было, тым больш у 1948-м Соф'я Захараўна трапіла ў аварыю, пакалечылася. Але выхавалі дваіх прыёмных дзетак. Вось што 12 ліпеня 1946 г. Міхась Лынькоў пісаў маладой жонцы ў санаторый у Еўпаторыі:

*«Софуня!*

*О чем тебе еще написать? Скучаю о тебе, Софунька, чертовски, просто порой свет не мил. Утешаюсь одним, что вот уже девять дней прошло со времени нашей «разлуки» и остается какой-нибудь сущий пустяк — недели три, не более. Время и пробежит как-нибудь. Все же, Софуня, привыкли мы друг к другу. Не знаю, как ты, а мне без тебя скучно-скучно. Дело, очевидно, не в привычке только. Трудно мне представить жизнь без тебя, «возмутительницы» моего спокойствия. Однако хватит объясняться тебе в любви, и без этого видишь, что люблю тебя, мою славную разбойницу».*

### «Самого себя отдал бы по куску — лишь бы вы были здоровы и счастливы»

Колькі рамантычных сцэн выпісаў у сваіх творах Уладзімір Караткевіч! Ліст да мастацтвазнаўцы Ніны Молевай ад 2 студзеня 1960 года пераносіць нас на старонкі рамана «Нельга забыць». Памятаеце, галоўны герой Андрэй Грынкевіч, пакутуе ад кахання да сваёй выкладчыцы па Літаратурным інстытуце, і каб прабавіць час вакацый, знясільвае сябе пісаннем ды гонкай на лыжах па пакручастых схілах? Вось тое ўсё дакладна адбывалася з Караткевічам у жыцці.



*«Вот уже два дня я здесь, в снегах, а глазам все представляются улочки Замоскворечья, талая вода, тени деревьев. И вы. Боже мой, какой я был дурак! Почему я не вел себя иначе, почему еще раз не сказал вам всего, не уверил, что все будет хорошо?*

*Так все глупо получилось, так мгновенно!*

*И сразу начали говориться слова, которые нужно было сказать. Почему это, когда любишь, когда это всего нужнее — начисто лишаешься дара слова?*

*...Родной мой, хороший мой человек — всё будет великолепно, вот запомните мои слова. И помните, хотя бы на минуту, что есть на Земле человек, который самого себя отдал бы по куску — лишь бы вы были здоровы и счастливы. Все мои желания, мысли — всё устремлено на это. И это будет.*

*Сегодня ночью видел вас во сне. Была большая, очень светлая комната с огромным окном. За окном были заиндевевшие деревья и снег. А вы сидели спиной к окну. У вас была высокая и необычайно красивая причёска. На вас было белое бальное платье. Вы смотрели и улыбались — больше ничего.*

*Проснулся от глубокого, все заполняющего счастья и долго не мог заснуть. За окном тоже был снег, падал на ветки деревьев. Мне казалось, что он должен звенеть, но он падал совсем бесшумно...*

*Родная моя, видно, у меня сейчас одна судьба: думать о вас, беспокоиться о вас. И мне другой судьбы не нужно.*

*Будьте счастливы.*

*Владимир»*

Што ж, спадзяюся, шчырыя словы каханя беларускіх класікаў камусьці дапамогуць знайсці свае ўласныя, словы, каб звярнуцца да любага чалавека.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### ИНФОРМИРУЕТ о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу (Кореличский филиал)

**Аукцион состоится 27.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок: 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 431/С-11599 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание «Цеха по производству хлебобулочных и кондитерских изделий»), общей площадью 977,0 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, ул. Пионерская, 29;<br>- капитальное строение, инв. № 431/С-13266 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), общей площадью 190,1 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, ул. Пионерская, 29;<br>- оборудование: стол циркулярный; котел газовый; счетчик газа; клапан; шкафной регуляторный пункт; насос; насос; насос; бак-расширителя; шкафной регуляторный пункт; фильтр; шкаф распределительный; вводное устройство; распределительное устройство; насос; насос; шкаф расстоечный; горелку блочную; щит автоматический; щит автоматический; щит автоматический; печь для хлебопечения; горелку блочную; бак водомерный; печь РТ-150; кондиционер; кондиционер; кондиционер; корректор к газовому счетчику; котел паровой ВХ-200; автомат контроля герметичности с клапаном эл.; напольный чугунный котел; напольный чугунный котел; каскадный регулятор котлов; теплосчетчик ТС-05 «Струмень»; котел газовый напольный Гризли, Proterm, 85 KLO.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355700001001105, площадью 0,4664 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий специализированных для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (хлебопекарня) по адресу: Кореличский р-н, г.п. Мир, ул. Пионерская, 29 |
| **Начальная цена продажи** | 260 882,08 руб. (двести шестьдесят тысяч восемьсот восемьдесят два рубля восемь копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 26 088,21 руб. (двадцать шесть тысяч восемьдесят восемь рублей двадцать одна копейка) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 23.02.2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 01.12.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

Утерянный билет учащегося УО «5-й лицей транспортного строительства» на имя ЛИЧИКА Кирилла Анатольевича **считать недействительным.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2023.Б.002.00022

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

**Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:**

**Лот № 1. Недвижимое и движимое имущество. Информация о предмете торгов, в т.ч. место нахождения (№ 3/12-2022).**

Кап. строение с инв. № 500/С-22831 площадью 1412 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/ 28, наименование: З 2/К Цех перлита, назначение: здание специализированное для производства строительных материалов, инв. № по бухг. учету 100015. Кап. строение с инв. № 500/С-67305 площадью 18,9 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/52, наименование: насосная станция, назначение: здание неустановленного назначения, инв. № по бухг. учету 17. Кап. строение с инв. № 500/С-13013376 площадью 147,4 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/32, наименование: затарочная перлита, назначение: здание неустановленного назначения, инв. № по бухг. учету 400385. Вышеуказанные кап. строения находятся на зем. участке с кадастровым № 500000000006004407, площадью 4,3601 га по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47 (общее долевое право постоянного пользования). Покупателю переходит доля в праве постоянного пользования зем. участка с кадастровым № 500000000006004407 из расчета площади для обслуживания объектов 3900 кв. м. Газорегуляторная установка, инв. № 501664, сооружение подземной галереи (материалы), сооружение склада готовой продукции с бункерами (материалы). Движимое имущество находится по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47.

**Начальная цена:** 617 217,37 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена**: 493 773,90 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 1:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение имущества на общую сумму **12 897,00** бел. руб. без НДС. Ознакомиться с перечнем имущества можно на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by.

**Движимое имущество находится по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47.**

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение торгов и оплатить услуги оператора ЭТП; возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 (десяти) рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи; демонтаж, погрузка и вывоз имущества осуществляется за счет Покупателя в срок, указанный в договоре купли-продажи.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: **17.03.2023 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ **по 16.00 16.03.2023.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 16.03.2023.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме **61 721,73** (шестьдесят одна тысяча семьсот двадцать один рубль 73 копейки) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация:

Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 17 374 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов: +375 44 7936318; +375 44 793 73 06.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) в рабочих дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества (г. Минск, ул. Я. Мавра, 47).

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

## Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** (одним лотом)<br>Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1, 1/1 – 1/3** | |
| **Производственная база** в составе: **АБК** (1565 **кв. м**, 640/С-25904), **производ. корпус** (3194,6 **кв. м**, 640/С-25908), **здание механич. мойки** (293,4 **кв. м**, 640/С-25911), **здание АЗС** (31,9 кв. м, 640/С-25949).<br>***Сведения о земельном участке:*** пл. **1,9846** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов администрат. назначения. Ограничения (обременения): расположен на природ. территориях, подлежащих спец. охране (охрана вод. объекта) | |
| ***Обременения:*** площади зданий с **инв. №** 640/С-25904 и 640/С-25908 частично сданы в аренду | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 969 456,00 бел. руб.** (снижена на 15 **%**) | |
| **Лот № 2.**<br>Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, Покрашевский с/с, д. Покрашево** | |
| **Магазин № 59 – 116,2 кв. м, инв. №** 640/С-26842.<br>***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0651** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации здания магазина | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 14 904,00 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| **Лот № 3**<br>Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, Рачковичский с/с, д. Танежицы, ул. Первомайская** | |
| **Магазин № 171** – **96,3 кв. м, инв. №** 640/С-26882, составные части и принадлежности: два сарая, уборная.<br>***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0918** га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания магазина | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 12 096,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Лот № 4** (одним лотом)<br>Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, Гресский с/с, аг. Греск, ул. Пролетарская, 10, 10/1, 10/2** | |
| **Магазин № 41** (393,1 **кв. м**, 640/С-26672), **здание склада кирпичного** (95,1 **кв. м**, 640/С-70156), **здание магазина № 42** (771 **кв. м**, 640/С-68556, составные части: подвал, навес).<br>***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,2949** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли | |
| **Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 37 749,30 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Лот № 5** (одним лотом)<br>Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/3, 136А/6** | |
| **Производственное здание** (2283,5 **кв. м**, 640/С-84561), **водонапорная башня** (2,9 **кв. м**, 640/С-84564), **артезианская скважина** (640/С-94208).<br>***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,7458** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 10.01.2033) для обслуживания производ. здания, артез. скважины и водонап. башни. Ограничения (обременения): водоохранная зона; охран. зоны ЛЭП до 1000 В (пл. 0,0103 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,0560 га) и канализации (пл. 0,0962 га) | |
| **Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 210 435,46 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Лоты **№№** 1, 4, 5 – 50 **%** от стоимости предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дней со дня заключения договора купли продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев. Лоты **№** 2, **№** 3 – оплата (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дня с момента подписания договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 **%**, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение: по лоту **№** 1 – 1,5 **%**, по лотам **№№** 2–4 – 6 **%**, по лоту **№** 5 – 3 **%** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
